ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР.

№ 80 (1614) | Аўторак, 10 кастрычніка 1961 года | Цана 4 кап.

На Магілёўскім заводзе штучнага валакна добра ведаюць памочніка майстра другога бабінажнага цэха камуніста Марыю Кірылаўну Кавалёву. Чатырнаццаць год працуе яна на вытворчасці пасля заканчэння школы ФЗН. Цэху, якім яна кіруе, аднаму з першых на заводзе прысвоена высокае званне калектыву камуністычнай працы.

На Магілёўскай абласной партыйнай канферэнцыі Марыя Кірылаўна Кавалёва выбрана дэлегатам XXII з'езда КПСС.

Фота М. МІНКОВІЧА.

З СУЧАСНАСЦЮ ПОПЛЕЧ

Роздум над праектам Праграмы КПСС

Праз некалькі дзён у Маскве пачне сваю работу гістарычны XXII з'езд Камуністычнай партыі, які будзе самай знамянальнай вехай на шляху нашай краіны ў светлае камуністычнае Заўтра. Сярод дэлегатаў з'езда — рабочых, калгаснікаў, служачых, вучоных, будуць і пісьменнікі. І гэта не выпадкова. Партыя лічыць, што з ростам тэхнічнага прагрэсу і паляпшэння дабрабыту працоўных небывалае значэнне набывае эстэтычнае выхаванне. Сярод дэлегатаў з'езда мы сустрэнем жывых герояў «Працягу легенды» А. Кузняцова, раманаў Г. Нікалаевай, Д. Граніна, В. Кетлінскай, Е. Мальцава, І. Шамякіна. Усё гэта гаворыць аб тым, што ў апошні час значна палепшылася сувязь дзеячоў літаратуры і мастацтва з жыццём. Пісьменнік і кампазітар стаў жаданым госцем і на рыштаваннях гігантаў сямігодкі, і ў кукурузаводчым звяне. Героі яго будучых твораў дзеляцца з ім сваімі радасцямі і нягодамі. Пэўна таму з'явіліся на свет таленавітыя творы Вадзіма Кажэўнікава, Міхаіла Бубяннова, Сяргея Антонава аб сённяшнім дні, аб нашым сучасніку.

Значны крок у гэтым напрамку зрабілі літаратары нашай рэспублікі. На кніжных паліцах з'явіліся новыя кнігі Петруся Броўкі, Івана Шамякіна, Пімена Панчанкі, Максіма Танка. Радасна, што побач з кнігамі майстроў літаратуры дастойнае месца займае творчасць моладзі.

У Беларусі велічныя планы сямігодкі зробяць такія пераўтварэнні, якіх яна не бачыла за ўсю сваю гісторыю. Ужо больш трох год ідзе будаўніцтва гігантаў хімічнай індустрыі — Полацкага нафтаперапрацоўчага завода і Салігорскага калійнага камбіната, раду іншых прадпрыемстваў. Захапляюць поспехі працаўнікоў вёскі па ўздыму сельскагаспадарчай вытворчасці.

На жаль, наша літаратура, мне здаецца, не адлюстравала да гэтага часу на ўвесь рост героіку нашых дзён. У нас вельмі мала твораў аб сучасніках, аб сучаснасці. Калі рускі чытач сустрэўся з Балуевым, пазнаў сябе ў пранікнёных радках новай паэмы А. Твардоўскага, дык пра нашу літаратуру мы не можам сказаць, што за апошні час у ёй з'явіліся творы роўныя па сіле ўздзеяння на чытача названым кнігам.

Доўгі час на будаўніцтве Полацкага нафтаперапрацоўчага завода знаходзіліся многія беларускія пісьменнікі. Як вынік іх творчых камандзіровак нафтабудаўцы атрымалі не зусім удалую кніжку Сяргея Грахоўскага «Горад маладосці», некалькі вершаў таго ж аўтара і нізку вершаў Рыгора Барадуліна, розных па сваіх мастацкіх якасцях. Ці ж гэтага хопіць? Не! Безумоўна, не. Шматтысячны калектыў чакае новых твораў аб сабе, аб рабочай гвардыі рэспублікі. А пакуль на старонках рэспубліканскага друку нават не сустрэнеш дакументальную аповесць аб героях сямігодкі.

У рэспубліцы, мне здаецца, за апошнія гады аслабла работа з творчай моладдзю. Сталыя літаратары ў друку рэдка гавораць пра пісьменнікаў, якія робяць першыя крокі ў літаратуры. Чаму б, скажам, газеце «Літаратура і мастацтва» не ўзяць штосьці карыснае ў гэтым сэнсе ў «Літаратурной газете», дзе і Міхаіл Святлоў і Аляксандр Пракоф'еў праводзяць у «добры шлях» найбольш таленавітую літаратурную моладзь.

Удумваючыся ў мудрыя словы праекта Праграмы Камуністычнай партыі, дзе гаворыцца, што «культура камунізма, якая ўвабрала ў сябе і развівае ўсё лепшае, што было створана сусветнай культурай, — новая, вышэйшая ступень у культурным развіцці чалавецтва», хочацца сказаць, што ў эстэтычным выхаванні чалавека камуністычнага грамадства значная роля належыць і творчасці народных умельцаў, пачынаючым літаратарам, самадзейным кампазітарам, мастакам. Савецкі чалавек, шматгранны і высокаадукаваны, можа не толькі вынаходзіць аўтаматызаваныя паточныя лініі, але і стварацъ сапраўды высокамастацкія творы. Трэба толькі падтрымаць і накіраваць яго творчыя магчымасці. Можа, варта Саюзу пісьменнікаў падумаць аб тым, каб арганізаваць пераклічку літаратурных аб'яднанняў, як гэта робіцца ў брыгадах камуністычнай працы, а Саюзу кампазітараў прыкласці больш намаганняў да стварэння аб'яднанняў самадзейных кампазітараў у гарадах і на новабудоўлях.

Час кліча да новых вяршынь не толькі ў стварэнні матэрыяльнага багацця працоўных, але і ў эстэтычным выхаванні чалавека заўтрашняга дня.

Валянцін ЛУКША,
старшыня бюро літаб'яднання на будаўніцтве Полацкага нафтаперапрацоўчага завода, майстар.

У КНІГУ ГОНАРУ

Днямі калегія Міністэрства культуры БССР і прэзідыум БРК прафсаюза работнікаў культуры пастанавілі занесці ў Кнігу гонару лепшых работнікаў кінасеткі рэспублікі, якія ў спаборніцтве за дастойную сустрэчу XXII з'езда КПСС датэрмінова выканалі гадавыя планы кінаабслугоўвання насельніцтва.

У Кнігу гонару занесены: кінамеханікі М. Бурачэўскі, С. Адзінец (Асіповіцкі раён), С. Каган, М. Кацнельсон, В. Карнаван (Бабруйскі раён), Я. Герасімава, М. Лазоўскі (Капыльскі раён), В. Кузаўкоў (Горацкі раён), М. Казакоў (Магілёўскі раён), І. Чугуноў (Крычаўскі раён), Ул. Масіеўскі, В. Гінтафт, І. Лазуцін (Чавускі раён), Ц. Цямніцкі (Быхаўскі раён), М. Пракапенка, П. Чахуноў, В. Чэпікаў (Касцюковіцкі раён), Н. Купрыянава (Краснапольскі раён). І. Казлякоўскі (Столінскі раён), а таксама шафёр-матарыст Бабруйскага раённага аддзела культуры М. Сянчук і майстар Полацкай кінарамонтнай майстэрні П. Каваленка.

За актыўную прапаганду літаратуры ў Кнігу гонару Міністэрства культуры БССР занесены Смалявіцкая раённая дзіцячая бібліятэка (загадчык Я. Нехвядовіч), Смалявіцкая раённая бібліятэка імя М. Багдановіча (загадчык М. Александрова), Дзяржынская раённая бібліятэка (загадчык Б. Сівашынская), Крупская раённая бібліятэка (загадчык І. Алексіевіч), Новабарысаўская гарадская бібліятэка (загадчык Л. Гурэвіч), Маладзечанская гарадская цэнтральная бібліятэка імя Н. Крупскай (загадчык К. Ліпіхіна), а таксама загадчык Копыскай сельскай бібліятэкі Аршанскага раёна Р. Смалякоў, загадчыца Высоцкай сельскай бібліятэкі Аршанскага раёна В. Барысава і загадчыца Парэчанскай сельскай бібліятэкі Талачынскага раёна Л. Буевіч.

Рэспубліканская кніжная выстаўка ў Мінску

У Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя Ул. І. Леніна адкрылася выстаўка кніжнай прадукцыі выдавецтваў Беларусі, прысвечаная XXII з'езду КПСС.

На ёй шырока прадстаўлена палітычная, навуковая, вучэбна-педагагічная, сельскагаспадарчая, мастацкая, вытворчая і даведачная літаратура. Вялікае месца таксама займаюць палітычныя плакаты.

Экспазіцыя ахоплівае больш 1000 выданняў. Яна знаёміць наведвальнікаў з ростам кнігавыдавецкай справы ў рэспубліцы за мінулыя 20 год і паказвае перспектывы выпуску літаратуры і іншых выданняў аж да 1980 года.

У выстаўцы прымаюць удзел Дзяржаўнае выдавецтва БССР, вучэбна-педагагічнае выдавецтва, сельскагаспадарчае выдавецтва, выдавецтва ЦК КПБ «Звязда», Міністэрства вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесіянальнай адукацыі, Акадэміі навук БССР, газетна-часопіснае выдавецтва і рэдакцыйна-выдавецкія аддзелы Інстытута навукова-тэхнічнай інфармацыі і прапаганды Саўнаргаса БССР і Дзяржаўнай бібліятэкі імя Ул. І. Леніна, паліграфічны камбінат імя Якуба Коласа.

Выстаўку адкрыў Міністр культуры БССР Р. Я. Кісялёў. Паказ лепшых узораў кніжнай прадукцыі выдавецтваў рэспублікі працягнецца да 15 кастрычніка. Адбудуцца сустрэчы паліграфістаў, выдавецкіх работнікаў, мастакоў, дзеячоў культуры для абмеркавання пытанняў паляпшэння мастацкага афармлення і паліграфічнага выканання.

Антон БЯЛЕВІЧ

ВЕДАЙЦЕ

Ведаю: на свеце ёсць дзяржавы,
Дзе цяплынь стаіць праз круглы год.
Ды няма там гэтакае славы,
Заручон з якою мой народ.

Ведаю: растуць алівы ў полі,
А дзівосны лотас—каля рэк.
Ды няма там гэтакае долі,
У якой жыве наш чалавек.

Ведаю: з паходняю Свабода
Велічна стаіць і ноч, і дзень.
Ды няма там шчасця для народа,
Над Свабодай змроку чорны цень.

І ні тыя пальмы, ні алівы
Не крануць экзотыкай мяне.
Ведайце: я тым ужо шчаслівы,
Што радзіўся ў роднай старане.

Каля ганку наша арабіна
Мне мілей за лотас, пальмаў гай.
Са сваёю ласкай галубінай
Увайшоў у сэрца мілы край.

Нёс яго праз буры, навальніцы,
Данясу ў расквет наступных дзён.
А няма ні меры, ні граніцы
Любасці да краю—гэткі ён.

Я іду: лён—злева, жыта—справа,
Граюць горны срэбныя зару:
Гэта ўсё маё, мая Дзяржава,
Сэрцу дарагая Беларусь.

Заспяваю я—па росах рэха
Коціцца ў туман — халодны дым,
І даспелым коціцца арэхам
Па лістах, па сэрцы па маім.

А надыдзе восень—над азімай
Рунню шаўкавінкі павуцін.
О, мая зямля, мая Радзіма,
Вам я да канчыны верны сын.

І ні тыя пальмы, ні алівы
Не крануць экзотыкай сваёй.
Ведайце: я тым ужо шчаслівы,
Што жыву ў краіне дарагой!

ВЫСОКАЯ ПАСАДА

Героі нашых дзён

«...Адзін камсамолец з Варашылаўградскай вобласці напісаў мне: «Ты, таварыш Ангеліна, ужо семнаццаць год выдатна працуеш на трактары. Здзіўляюся, чаму цябе не вылучаць на больш высокую пасаду?»

Дзівак-чалавек! Ды хіба справа ў пасадзе?.. Многія з радавых людзей майго пакалення вылучаліся на адказную работу. А я па-ранейшаму застаюся трактарысткай і ганаруся гэтым, таму што ў нашай краіне кожная пасада ёсць высокая пасада, трэба толькі ўсёй душой аддавацца сваёй рабоце...»

Вольга падкрэсліла гэтыя радкі ў кніжцы славутай трактарысткі Праскоўі Ангелінай «Аб самым галоўным» і задумалася. Як хораша і проста напісала Ангеліна аб тым, пра што яна, Вольга Харанека, да гэтага столькі думала!

У іхняй вёсцы Кіцін, вядома ж, не было і завядзёнкі, каб хто з дзяўчат садзіўся за руль трактара. Вольгін бацька, Якаў Іванавіч, усё думаў, што дачка, як скончыць сямігодку, падасца куды ў сельскагаспадарчы тэхнікум. Бацька вельмі любіў разводзіць сады. За іхнім домам каторы ўжо год кожную восень галіны яблынь аж згіналіся ад буйных антонавак. А Якаў Іванавіч марыў вывесці свой адмысловы гатунак.

— Вось падвучышся, паразумнееш, — звычайна гаварыў ён Вользе, калі яна пасля ўрокаў прыбягала да яго ў сад, — і выведзем мы з табой «рабінаўку». Цудоўныя яблыкі будуць. Хоць і познія, затое да новых ляжаць будуць...

— А чаму — «рабінаўку»? — не разумела Вольга.

Стары Харанека пагладжваў чыста паголены падбародак і пахвальна глядзеў на дачку: падабалася яму, што Вольга расла дапытлівай дзяўчынкай. Такая да ўсяго дакапаецца. І Якаў Іванавіч тлумачыў, што даўно думае вывесці яблыню, каб і смак быў адметны ў ёй і да марозаў каб устойлівай была, бы тая рабіна. Гронкі рабіны Вольга са сваёй сяброўкай Марыйкай Навоевай не раз абламвалі позняй восенню ў лесе. Цэлыя кошыкі прыносілі яны тых гронак дадому, і маці падвешвала пучкі ягад на гарышчы, каля коміна. Ах жа і смачныя былі ягады, калі мароз ужо размалёўваў шыбы дзіўнымі ўзорамі і зімовымі вечарамі патрэскваў па вуглах!

— Расці, дачушка. Вучыся, — гаварыў звычайна Якаў Харанека сваёй Вольцы. — Садаводам будзеш...

Не ведаў Якаў Іванавіч, што яго смяшлівая сінявокая Волька даўно ўжо дамовілася з маўклівай Марыйкай Навоевай пасля сямігодкі пайсці вучыцца на трактарыстак. У тваіх руках руль машыны, ты чуеш, як б'ецца сталёвае сэрца трактара, удыхаеш прэсны пах узаранай зямлі, — ці ж гэта не хораша? Яны свайго даб'юцца, яны стануць трактарысткамі!

— Ой, мамачкі мае! — усплёснула далонямі Аксіння Хорт, калі пачула ад вольчынай маці, што дачка тае збіраецца ў Гомель вучыцца на трактарыстку. — Ці ж жаночая гэта справа? Ніхто і не прыме яе туды. Вось даю слова: стане ваша Вольга трактарысткай, пайду да яе прычэпшчыцай.

— Не трэба так казаць, Аксіння, — сурова падціснуўшы губы, адказала маці Вольгі. — Ты ж ведаеш яе характар. Глядзі, каб не прыйшлося табе яшчэ шкадаваць аб сказаным: давядзецца садзіцца на плугі...

У душы ж і маці трохі трывожылася: як ні кажы, а не жаночая справа кожны дзень важдацца з машынай, мець справу з зямлёй, плугамі. Ды яна ведала: калі ўжо што задумала дачка, дык яе не адгаворыш. Зноў жа на курсы тыя ехала і Марыя Навоева. Гэтую чарнявую, бы цыганка, дзяўчыну ўжо даўно многія кіцінцы прыкмецілі: сур'ёзнае дзяўчо, шчыруха, не раўнуючы, як тая мурашка.

Вясною 1954 года ехалі Вольга з Марыяй у Гомель, у школу механізацыі сельскай гаспадаркі. Каля калодзежа з поўнымі вёдрамі стаяла Аксіння і насмешлівым позіркам праводзіла дзяўчат: «Няхай едуць, бацькава кішэня вытрымае. Аднак жа хутка вы, галубкі, і назад прыляціце...» А Вольга глядзела на Аксінню і са злосцю думала: «Пачакай, цётачка! Яшчэ можа сядзеш да мяне прычэпшчыцай. Прыкусіш тады доўгі свой язык!»

Стаялі пагодлівыя майскія дзянькі. Якаў Іванавіч хадзіў па сваім садзе і дакорліва ківаў галавой: не засталася дачка дома, паехала. А яблыні і грушы цвілі. Цвілі, быццам дрэвы абсыпаў хто снегам. У ружаватых чашачках працавіта капашыліся пчолы з жоўтымі ад пылку брушкамі. Харанека тупаў паміж дрэў і адчуваў, як шчымела сэрца: не паслухалася бацькі Вольга. Што ж, няхай выбірае працу па душы. Ён так і сказаў тады дачцы:

— Едзь на здароўе. Вучыся сабе на трактарыстку. Ды памятай, дзеўка: зямля не любіць жартаў. Яна павагу, любоў ад чалавека патрабуе.

Школа механізацыі знаходзілася ў прыгарадзе Гомеля — Лешчынцы. Сяброўкі і спалі на адным ложку ў інтэрнаце. А вечарамі, калі вярталіся з заняткаў, доўга размаўлялі пошапкам, дзяліліся запаветным адна з другой. Вольга і не думала, што Марыя Навоева такая сардэчная, шчырая дзяўчына.

— Як хочацца, Волечка, хутчэй вярнуцца ў Кіцін! — прызналася тая аднойчы сяброўцы. — Мала ж там трактарыстаў, а зямля чакае.

— А можа нас і не пашлюць у сваю вёску? Могуць жа і ў іншы калгас накіраваць...

— Папросімся ў «Чырвоную зорку». Тут і палі, і людзі нам добра знаёмыя.

Не, дарэмна яны трывожыліся. Вось ужо і пасведчанні трактарыстак у кішэнях ляжаць і стаяць яны перад дырэктарам МТС Аляксандрам Фёдаравічам Зорыным.

— Можна і туды,—сказаў дырэктар. — Але памятайце: напарнікамі ў вас будуць хлопцы. Так што не аканфузьцеся, дзяўчаткі. А калі трэба, дык і нос утрыце якому хвальку.

Дырэктар МТС, відаць, недарэмна папярэджваў сяброўак. Адзін з трактарыстаў — Мікалай Харанека ў першы ж дзень, калі змяняць яго на трактары прыйшла Вольга, зморшчыўся, бы той клоун, і прысвіснуў.

— Калі гэта было такое, каб я машыну здаваў жаночаму насенню?—сказаў ён.—Яшчэ слёзы папусціш, як дзе матор заглухне.

— Глядзі, каб ты раней не папусціў, — агрызнулася Вольга, спрытна залазячы на сядзенне. — Суседка наша Аксіння Хорт таксама раней языком малола здорава, а цяпер за вярсту мяне абмінае: баіцца, каб у прычэпшчыкі хаця не прызначылі...

— Ну, ну,—прабурчэў Мікалай. —Можа самую яшчэ пасадзяць прычэпшчыцай.

Дзяўчына толькі адмахнулася ад яго рукой. Дужымі рукамі Вольга пераводзіла рычагі, жмурылася ад сонца і ад ціхага шчасця сама сабе ўсміхалася. «Няхай трохі пабрэша языком гэты Мікалай Харанека — думала яна. — Усё ж ён не благі хлопец. А я вось вяду машыну, удыхаю водар узаранай зямлі. Мне хораша і слаўна...»

Мікалай стаяў, шкроб патыліцу і прыдзірлівым вокам сачыў, як завернецца на паваротах Вольга з плугамі. «Не, чарцяка,—з зайздрасцю падумаў ён.—Здорава націскае. Нават дарогу лемяхамі не драпанула...»

А потым зменшчыцай на Вольчыным трактары стала сяброўка—Марыя Навоева.

— А ўсё ж шкада, Волька, развітвацца з табой,—сказаў тады Мікалай, калі даведаўся, што пераходзіць на іншую машыну.

— Бач, які жаласнік,—паківала галавой Вольга.—Мы яшчэ прыпомнім табе «жаночае насенне»...

Ішоў 1958 год. Партыя кінула ўсе сілы на ўздым сельскай гаспадаркі краіны. Ці ж маглі яны, дзяўчаты, працаваць тады не на поўную сілу? Як толькі Вольга прыходзіла змяняць Марыю, тая ледзь не валілася з ног. Дзяўчына аж учарнела, і Вольга аднойчы ўстрывожана запытала: ці не захварэла тая?

— Дзівачка ты, Волька,—паківала Марыя галавой. — Зірні на сябе ў люстэрка і ў цябе адны вочы блішчаць... Стамляюся я. Лягу, дык ні ног, ні рук не чую,—прызналася яна.—Аднак жа мы дакажам, на што здатныя...

Яны такі і даказалі. У МТС неўзабаве дзяўчаты сталі першымі і далёка абагналі Мікалая Харанеку і іншых трактарыстаў па ўсіх паказчыках. Мусіць, гэта вельмі ўдарыла па яго самалюбству, бо колькі дзён хлопец стараўся нават не сустракацца з дзяўчатамі.

— Мы не горшыя за хлопцаў,— сказала старшыні калгаса Васілю Паўлавічу Нікіфараву Вольга. — Думаем, што добра ім прыйдзецца паднатужыцца, каб ад нас не адстаць.

Васіля Паўлавіча дзяўчаты, як і ўсе кіцінцы, паважалі. Чалавек высокай культуры, старшыня і цяпер, здавалася, заставаўся настаўнікам для сваіх калгаснікаў. На лацкане пінжака Нікіфараў і цяпер насіў значок «Выдатнік народнай асветы». У свой час Васіль Паўлавіч узначальваў самы большы ў вобласці Шчэдрынскі дзіцячы дом, у вайну партызаніў на Віцебшчыне. А калі Нікіфарава абралі старшынёй «Чырвонай зоркі», калгасныя справы ўвачавідкі падаліся ўгару.

— Я не пярэчу, — адказаў тады старшыня. — Толькі глядзіце, каб не падкачалі.

Ох, і папрацавалі ж дзяўчаты ў тыя дні! Каб не было пылу ад перасохлай зямлі, сеялі кукурузу ноччу. А потым — пачалася падкормка, догляд маленькіх кволых раслінак. Ішоў час, і кукурузныя сцяблы наліваліся сокам. Лапушыстае лісце ўсё смялей і смялей шапталася з ветрыкам, усё выразней вырысоўваліся акуратныя квадраты. Цяпер старшыня часцяком заглядаў на ўчастак дзяўчат. Прыходзіў, пагладжваў цыбатыя сцябліны і нешта сам сабе вылічваў.

— Каго вы там зачароўваеце?— жартам пытала на павароце трактара Вольга старшыню.

— Слаўная кукурузка расце,— радасна адказаў Васіль Паўлавіч. —Толькі б убраць у час.

— Убярэм! — супакоіла старшыню Харанека, а Навоева толькі бліснула з-пад доўгіх веек чорнымі вачыма і загадкава ўсміхнулася.

...І вось ужо іхні вёрткі трактар «Беларусь» пацягнуў за сабой новенькі кукурузаўборачны камбайн «Гомсельмаша». Высокія, бы той лес, сцябліны кукурузы захісталіся, падрэзаныя нажамі камбайна. Вольга расчырванелася. Хусцінка спаўзла з яе валасоў, што зусім выгаралі на сонцы. А побач, спатыкаючыся, спяшалася ў прамазучаным камбінезоне Марыя. Не магла яна спакойна адпачываць цяпер, калі сяброўка пачынала «зажынкі». Хацелася зрабіць і самой адзін-другі аб'езд.

Пад вечар проста на поле да дзяўчат прыйшла «Пабеда». З машыны выйшлі Нікіфараў і сакратар райкома партыі Васіль Пятровіч Шацкі.

— Ведаеце, колькі паказалі кантрольныя абмеры і ўзважванне?— запытаўся старшыня. — Больш васьмісот цэнтнераў сіласнай масы з гектара. З усёй плошчы!

Васемсот цэнтнераў з кожнага гектара на плошчы ў 90 гектараў. Нядрэнна! Але дзяўчаты і не думалі супакойвацца на дасягнутым. То быў іх падарунак студзеньскаму Пленуму ЦК КПСС. А затым трактарысткі вырашылі ўзяцца вырошчваць кукурузу механізаваным спосабам на плошчы ў 120 гектараў. Энергіі ў іх хапала. Ды і як было не старацца, бачачы, што іх паважаюць за працавітасць, за шчырасць, дабрату. Трапна сказаў некалі пісьменнік: выдатная пасада—быць на зямлі чалавекам! Яны ездзілі пераймаць вопыт да знатнага рэчыцкага механізатара Героя Сацыялістычнай Працы Івана Уласавіча Кулеша.

Неўзабаве Вольгу Харанеку выбралі дэпутатам абласнога, а Марыю Навоеву — дэпутатам раённага Саветаў дэпутатаў працоўных. Прыбавілася клопатаў, адказнасці. За званне ўдарніц камуністычнай працы вырашылі змагацца дзяўчаты.

Харашэла і іх родная вёска Кіцін. Цяпер у дзвярах клуба, калі пачыналі паказваць кіно, ужо не стаяў кантралёр. У клубе ўстанавілі стацыянарную кінаўстаноўку. 14 мастацкіх і 5 сельскагаспадарчых фільмаў у месяц дэманструецца ў «Чырвонай зорцы», ёсць калгасныя дзіцячыя яслі, у кожнай брыгадзе свая лазня, дзве бібліятэкі. Васіль Паўлавіч на кнігі грошай не шкадуе.

— Чытайце, дзяўчаткі, — гаворыць ён.—Я вось нядаўна прачытаў кніжку нашай вядомай трактарысткі Праскоўі Ангелінай. Выдатная, скажу вам, кніга.

Вось і чытае Вольга ў той кнізе словы, што кожная пасада ў нашай краіне—высокая пасада, калі ты будзеш усёй душой аддавацца рабоце. А яны з Марыяй, спаборнічаючы ў гонар XXII з'езда партыі, убралі ўжо вырашчаную кукурузу. І ўраджай зноў атрымаўся на славу.

Любіць асеннюю пару Вольга. Цяпер, калі папрасторней далягляд і шпакі вялікімі стаямі збіраюцца ў вырай, хораша думаецца. За акном у чыстым асеннім небе плыве павуціння. З дрэў падае залатое лісце. А прыслухаешся—і чуваць, як грукоча на паплавах за вёскай трактар: Марыя косіць атаву. Па саду тупае бацька, зграбае апалае лісце. Вольга ведае, што бацька ўсё вынашвае думку—вырасціць «рабінаўку». А за дачку ён рад і людзі яе паважаюць, любяць.

А ці ж трэба большага для бацькі?

Паўз вокны прайшла Аксіння Хорт у заляпаных гразёю ботах і пакасілася на акно. На познюю кветку вяргіні заляцеў калматы чмель. Дзяўчына перагарнула чарговую старонку кнігі.

А ў небе плыве і плыве павуціння.

М. ДАНІЛЕНКА.

АД ШЧЫРАГА СЭРЦА

НА КАНЦЭРТАХ МАЙСТРОЎ БЕЛАРУСКАЙ ЭСТРАДЫ

□

У Мінск часта прыязджаюць на гастролі розныя эстрадныя калектывы, джаз-аркестры. І нягледзячы на тое, што далёка не ўсе яны яшчэ могуць пахваліцца сваім арыгінальным, надзённым рэпертуарам, высокай культурай выканання, публіка валам валіць на іх канцэрты. Вось наколькі папулярны і ў вялікай модзе цяпер эстрадны жанр!

А ці ведаюць мінчане, што і ў нас у рэспубліцы паспяхова развіваецца сваё эстраднае мастацтва? І ўжо калі шчыра сказаць, дык нашы выканаўцы не ўступаюць гастралёрам. Іншая справа, што майстры беларускай эстрады, занятыя пераважна абслугоўваннем сельскіх гледачоў, яшчэ рэдка выступаюць у Мінску, мала знаёмяць шырокую аўдыторыю з навінкамі свайго рэпертуару. Таму з такой цікавасцю і былі сустрэты іх канцэрты ў акруговым Доме афіцэраў, якія з'явіліся своеасаблівай творчай справаздачай перад працоўнымі сталіцы напярэдадні XXII з'езда нашай партыі.

«Ад шчырага сэрца» — так паэтычна, па-народнаму назвалі беларускія артысты сваю новую канцэртную праграму. Яна, вядома, зроблена не ў форме нейкага цэласнага тэматычнага прадстаўлення або эстраднага агляду з адзінай ідэйнай задумай. Ды такая задача, відаць, і не ставілася. Гэта — зборны эстрадны канцэрт, куды ўвайшлі творы розных жанраў, пачынаючы ад вясёлых трапных жартаў, пародый і сцэнак вядучых артыстаў Мікалая Шышкіна і Рыгора Дзідзенкі і канчаючы фельетонамі, вакальнымі і інструментальнымі творамі, мастацкай акрабатыкай.

Ёсць спроба абыграць і асэнсаваць самую назву «Ад шчырага сэрца», надаць ёй мэтанакіраванае значэнне. Не выпадкова нават заключная песня, якая выконваецца ўсімі ўдзельнікамі канцэрта, пачынаецца тымі ж цёплымі, задушэўнымі словамі, звернутымі да прысутных у зале.

Першае і другое аддзяленні робяць не аднолькавае ўражанне. Яны розняцца не столькі падборам і характарам нумароў (тут розніцы амаль няма), колькі самім настроем, той творчай атмасферай, якая панує на сцэне на працягу ўсяго канцэрта. Першая палавіна праграмы, якую жыва вядзе артыст М. Шышкін, з уласцівым яму народным гумарам, глядзіцца значна цікавей, лёгка і весела. І хоць вядучы іншы раз злоўжывае сваімі рэпрызамі і ўстаўнымі жартоўнымі сцэнкамі, гэта не стамляе гледачоў і не выклікае ў іх суму.

Другое аддзяленне праходзіць у крыху запаволеным тэмпе, без сапраўднага творчага агеньчыку. У той час, як іменна пад канец праграмы павінен адчувацца такі агеньчык, павінна нарастаць своеасаблівае апафеознае гучанне фіналу, каб публіка панесла з сабою самыя добрыя ўспаміны аб эстрадным вечары. Р. Дзідзенка як вядучы другога аддзялення мае несумненна свае станоўчыя якасці: ён мякка, у стрыманай манеры, вядзе праграму, выступае з жартамі і пародыямі на розныя тэмы нашага жыцця. І ўсё ж хацелася б, каб ён пастараўся збавіць свой аднастайны «рэзанёрскі» тон і быў такім жа вясёлым, шчырым і дабрадушным артыстам, якім мы яго ўбачылі пры выкананні музычных сатырычных куплетаў на матыў вядомай рускай песні «Помню, я еще молодушкой была...»

З першага аддзялення запомнілася цікавая сцэнка размоўнага жанра «Партызанскія сустрэчы». Пабудаваная на беларускім матэрыяле з выкарыстаннем у якасці музычнага фону папулярнай «Лясной песні» Ул. Алоўнікава, яна расказвае пра тое, як штогод збіраюцца былыя беларускія партызаны на месцы баёў з гітлераўцамі, успамінаюць мінулыя паходы цёмныя ночы каля ляснога вогнішча, са смуткам успамінаюць сваіх загінуўшых баявых таварышаў. М. Шышкін усхвалявана перадаў змест гераічнага расказу, які суправаджаўся ўдала выкарыстанай у ім алоўнікаўскай музыкай.

Добра прымалі гледачы гераічныя музычна афармленыя фельетоны «Жыццё і песня» (выканаўца М. Зорын) і «Вяртанне сябра» (выканаўца — дыпламант Усесаюзнага конкурсу артыстаў эстрады В. Спіткоўская). Дарэчы, і напісаны гэтыя творы самім жа Зорыным у сааўтарстве з І. Меем.

Наша філармонія можа ганарыцца сапраўднымі эстраднымі спевакамі, такімі, як Э. Зігер, Э. Міцуль, М. Пушкароў, І. Вішнеўская. Асабліва вялікае ўражанне пакідае выступленне двух першых выканаўцаў, якія валодаюць моцнымі, вялікага дыяпазону галасамі, маюць добрую тэхніку і музычнасць. Шкада толькі, што Э. Зігер і Э. Міцуль крыху збядняюць свае вакальныя магчымасці, трацячы свае сілы на выкананне даволі немудрагелістых, «экзатычных» песенак, накшталт «Аргенцінскай карнавальнай», кубінскай «Маленькая лодачка» або вельмі сентыментальнай песні Кузняцова «Першыя кветкі». І наогул, чаму Э. Міцуль павінен спяваць абавязкова адны інтымныя, любоўныя песні? У беларускага ж спевака выдатны голас і ён можа з поспехам выконваць не толькі песенны рэпертуар, але і арыі з класічных аперэт і камічных опер, а разам з Э. Зігер — дуэты з музычных камедый савецкіх кампазітараў. Гэта не пад сілу,скажам, І. Вішнеўскай (яе вакальныя здольнасці даволі сціплыя і абмежаваныя), таму яна як лірычная жанравая спявачка зусім правільна падбірае для сябе рэпертуар.

Зноў парадаваў сваёй віртуознай тэхнікай ігры на цымбалах лаўрэат VI сусветнага фестывалю моладзі ў Маскве В. Бурковіч. У суправаджэнні піяністкі П. Ханіс, якая, дарэчы, добра акампаніравала на працягу ўсяго канцэрта, беларускі цымбаліст выканаў дзве венгерскія народныя мелодыі і «Лязгінку».

На наш погляд, не зусім удалы першы нумар праграмы — фантазія на тэмы песень беларускіх кампазітараў, напісаная канцэрт-майстрам філармоніі Л. Молерам і выкананая інструментальным секстэтам. Па сваёй музыцы яна эклектычная і малавыразная. Шкада, што нам не давялося ўбачыць добрага танцавальнага нумара, таму што жартоўная харэаграфічная сцэнка «Перад экзаменам» у выкананні А. Воўчык і В. Цярэшчанкі — бедная па сваёй задуме і не вызначаецца выдатнымі пастановачнымі якасцямі.

Варта адзначыць выступленне артыстаў арыгінальнага жанра Ван Лі, А. Дудкіна, акрабатычную пару майстроў спорту Н. Цімафееваі і В. Ржэвускага. Яны дапоўнілі і зрабілі больш разнастайнай канцэртную праграму.

Выступленні беларускіх эстрадных акцёраў паказалі, што гэты жанр мастацтва паспяхова развіваецца ў рэспубліцы.

Г. ЗАГАРОДНІ.

Праграму вядзе артыст Мікалай Шышкін.

Спявае Элеанора Зігер у суправаджэнні інструментальнага квартэта.

НОВЫ РЭПЕРТУАР, НОВЫЯ ВОБРАЗЫ

Адкрылася заслона ў Тэатры оперы і балета. Нашы першыя сустрэчы з гледачамі адбыліся ў знамянальны час, калі ўвесь савецкі народ рыхтуе дастойную сустрэчу XXII з'езду партыі. Да гэтай выдатнай падзеі рыхтаваўся і калектыў тэатра.

Праект Праграмы партыі патрабуе стварэння такіх спектакляў, якія закліканы служыць крыніцай радасці і натхнення для мільёнаў людзей, выказваць іх волю, пачуцці і думкі, служыць сродкам іх ідэйнага ўзбагачэння і маральнага выхавання.

Свой новы сезон мы пачалі ўдзелам у рэспубліканскім агляде — «Сучасная тэма ў мастацтве Савецкай Беларусі». Апроч прэм'еры — балета Я. Глебава «Мара» (лібрэта Я. Рамановіча), у дні агляду мы паказваем ужо знаёмыя многім гледачам оперы Ю. Семянякі «Калючая ружа» і А. Туранкова «Яснае світанне», а таксама балет А. Кара-Караева «Сцежкаю грому».

Балет «Мара» з'яўляецца першым беларускім савецкім балетным спектаклем, які прысвечаны падзеям сённяшніх дзён. Ён расказвае пра лёс простай беларускай дзяўчыны, якая ў маленстве трапіла на чужыну, адчула ўсе «прыгажосці» так званага капіталістычнага «раю» і знайшла сваё шчасце толькі пасля вяртання на Радзіму.

Гісторыя беларускай танцаўшчыцы Марыі дала магчымасць аўтарам і пастаноўшчыкам балета ў яркім і кантрасным процістаўленні паказаць агідныя рысы капіталізму і светлыя карціны сацыялістычнай рэчаіснасці, паказаць розны лёс мастака ў нас і за рубяжом.

У спектаклі заняты амаль усе артысты балетнай трупы. У ім таксама прымаюць удзел вучні харэаграфічнага вучылішча.

У творчай садружнасці з кампазітарам Г. Вагнерам і пісьменнікам М. Алтуховым тэатр працуе над другім сучасным балетам. Яго ўмоўная назва «Цудоўнае святло». Тэма яго — дружба братніх савецкіх народаў і іх барацьба з перажыткамі мінулага, якія перашкаджаюць нам у будаўніцтве камуністычнага грамадства. Кампазітарам ужо напісан клавір і значная частка партытуры. У сярэдзіне 1962 года мы мяркуем паказаць яго гледачам.

У канцы будучага года мы спадзяемся паставіць і новую сучасную лірычную оперу Ю. Семянякі па лібрэта А. Бачылы. Опера «Залаты вальс» аб жыцці нашых маладых вучоных.

Кампазітар Я. Глебаў разам з лібрэтыстам М. Алтуховым пачынае пісаць камічную оперу аб жыццярадаснай беларускай моладзі.

У снежні пакажам оперны спектакль па твору ўкраінскага савецкага кампазітара Ільі Польскага «Церамок» (лібрэта С. Маршака). Пастаноўка гэтай оперы дасць магчымасць пашырыць кантынгент нашых гледачоў за лік дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту. У гэтай оперы для маленькіх удала спалучаецца займальнасць сюжэта з меладычнай выразнай музыкай і каларытнай аркестроўкай.

Другім оперным спектаклем сезона з'явіцца опера М. Рымскага-Корсакава «Майская ноч». У светлай меладычнай музыцы оперы выдатна ўвасоблены паэтычныя вобразы народна-казачнай фантастыкі, жывапісныя карціны ўкраінскай прыроды, якія ствараюць паэтычную рамку для гогалеўскага сюжэта, сагрэтага лірызмам і шчырым гумарам.

З зарубежнай класікі будуць пастаўлены рамантычная опера К. Вэбера «Чароўны стралок», камічная опера Д. Обера «Чорнае даміно» і опера Дж. Пучыні «Дзяўчына з Захаду».

Бліжэйшай пастаноўкай балетнай трупы тэатра будзе твор французскага кампазітара А. Адана «Жызель». Драматычна насычаны сцэнарый балета, меладычная і задушэўная музыка стварылі гэтаму балету сусветную славу. Нягледзячы на складанасць партыі Жызелі, у нас ёсць упэўненасць, што таленавітыя балерыны Л. Ражанава, І. Савельева, Н. Давыдзенка і А. Карэнкова здолеюць перадаць шчырасць пачуццяў, душэўную чысціню і паэтычнасць вобраза.

У адзін вечар з двухактовым балетам «Жызель» мы збіраемся паказваць гледачу аднаактовы балет «Шэхеразада», створаны па сімфанічнай сюіце М. Рымскага-Корсакава.

У тэатры распрацаван двухгадовы план капітальнага ўзнаўлення оперных і балетных спектакляў. Гэта оперы «Барыс Гадуноў», «Аіда», «Фаўст», «Дзяўчына з Палесся», балет «Дон-Кіхот». У спектаклі будуць уведзены новыя выканаўцы, мы таксама зробім для іх новае афармленне.

У рэпертуары нашага тэатра яшчэ вельмі слаба прадстаўлены лепшыя оперы і балеты кампазітараў саюзных рэспублік і братніх сацыялістычных краін. На нашай афішы павінны заняць належнае месца і такія творы.

У апошнія гады адбылося значнае амаладжэнне ўсіх творчых калектываў тэатра. Пакінулі сцэну многія старэйшыя майстры опернага і балетнага мастацтва, якія адыгралі вялікую ролю ў творчым станаўленні тэатра. Некалькі маладых, здольных спевакоў улілося ў калектыў салістаў і сёлета. Сярод іх выхаванка Саратаўскай кансерваторыі (мецца-сапрана) Роза Анікеенка, выпускнік Белдзяржкансерваторыі Міхаіл Пушкароў (бас), Іван Шчацінін (тэнар). У балетны калектыў прыйшла група выпускнікоў Мінскага харэаграфічнага вучылішча. Новымі маладымі сіламі папоўніліся хор і аркестр. Цяпер у тэатры сфармаваўся моцны творчы калектыў, здольны вырашаць самыя складаныя мастацкія задачы.

У шматлікім калектыве тэатра сотні артыстаў і работнікаў дапаможных цэхаў — дэкаратараў, касцюмераў, краўцоў, бутафораў, грымёраў-мастакоў і многіх іншых афарміцеляў спектакля. Усіх іх яднае адзіная мэта — служыць сваёй працай народу, узбагачаць яго духоўнымі каштоўнасцямі, прыносіць яму радасць.

Добрай традыцыяй сталі выступленні на сцэне нашага тэатра буйных зарубежных майстроў. Мінчане высока ацанілі вакальнае і акцёрскае майстэрства выступаўшых у мінулым сезоне Эдуарда Гакена (Чэхаславакія), Карнела Стаўру і Марыі Валашэску (Румынія), Надзі Шарковай (Балгарыя), Багдана Папроцкага (Польшча) і Рыты Гор (Францыя). Гэтыя творчыя сувязі мы будзем працягваць і ў новым сезоне. Яшчэ сёлета плануем выступленне на сцэне нашага тэатра саліст Варшаўскай оперы Алісіі Данькоўскай і салісткі Сафійскай оперы, лаўрэата міжнародных конкурсаў Марыі Бахачак і першай салісткі той жа оперы Юліі Вінер. У кастрычніку на сцэне нашага тэатра будзе выступаць трупа Цэнтральнага тэатра оперы і балета Кітайскай Народнай Рэспублікі, які з'яўляецца адным з самых буйных калектываў краіны. Кітайскія госці пакажуць тры сваіх лепшых балеты: «Чароўны ліхтар» Чжан Сяо-ху, «Паўстанне саюза мячоў» Шан І і «Вежа Лэйфынта» Лян Кэ-сяна.

З дапамогай Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі тэатрам наладжана творчая сувязь з Нямецкай дзяржаўнай операй. З ГДР прыслалі нам клавір, эскізы афармлення і касцюмаў, а ў бліжэйшыя дні прышлюць і партытуру оперы Р. Штрауса «Кавалер ружаў», якую мы паставім на нашай сцэне. У сваю чаргу мы паслалі нямецкім сябрам камплект фатаграфій, якія адлюстроўваюць творчую дзейнасць Беларускага тэатра.

За апошнія гады рэпертуар тэатра папоўніўся радам буйных твораў класікі («Садко», «Чарадзейка», «Пікавая дама», «Бал-маскарад», «Казка пра мёртвую царэўну і сем волатаў» і інш.) і, што асабліва важна, творамі савецкіх кампазітараў, якія адлюстроўваюць актуальныя тэмы сучаснасці (балет А. Кара-Караева «Сцежкаю грому» і опера Ю. Семянякі «Калючая ружа»).

Аднак нас слушна дакаралі за тое, што ў рэпертуары тэатра надта вялікае месца займалі аперэты «Карневільскія званы», «Цыганскі барон». Улічваючы гэта, мастацкі савет тэатра вырашыў адмовіцца ад пастаноўкі запланаванай на 1962 год аперэты Ж. Афенбаха «Цудоўная Алена».

У новым сезоне мы будзем нястомна павышаць ідэйна-мастацкі ўзровень спектакляў, удасканальваць музычнае, вакальнае і сцэнічнае майстэрства. Нашы спектаклі маюць яшчэ істотныя недахопы. Некаторым з іх нестае глыбокай рэжысёрскай думкі. Артысты оперы і балета, ствараючы той ці іншы вобраз, часта абмяжоўваюцца сродкамі вонкавай выразнасці, слаба адлюстроўваюць унутранае жыццё—думкі і пачуцці герояў. У сцэнічных паводзінах асобных выканаўцаў нярэдка адсутнічае жыццёвая праўда. Ёсць і іншыя недахопы, без ліквідацыі якіх не можа быць сапраўды паўнацэнных спектакляў.

Стварэнню паўнацэнных музычна-сцэнічных твораў замінае недахоп рэжысёрскіх кадраў.

Апроч работы на стацыянары, калектыў тэатра наладзіць творчыя сустрэчы на буйных прадпрыемствах і ў навучальных установах. Будуць наладжвацца выезды ў раёны з канцэртамі і спектаклямі для калгасных гледачоў. Значна большай павінна быць наша шэфская дапамога мастацкай самадзейнасці і народным універсітэтам культуры.

П. ЛЮТАРОВІЧ,
дырэктар Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета.

Сцэна з балета «Мара».

РОЗНЫЯ ПОЧЫРКІ, РОЗНЫЯ МАНЕРЫ

Брэстчане зноў знаёмяцца з творчасцю народных умельцаў на абласной выстаўцы.

Прыемна ўражае тое, што пашырыўся мастацкі кругагляд многіх самадзейных майстроў, глыбіня іх бачання жыцця, палепшылася культура іх працы, з'явілася багата элементаў сапраўднага прафесіяналізма.

Гэта прыкметна ва ўсёй экспазіцыі і асабліва яркa ў некаторых найбольш значных творах.

Цікавыя творчыя пошукі вучня 6-й сярэдняй школы Брэста Г. Нічыпурука. Серыя яго эцюдаў—«Вечар», «Возера», «Маўклівыя каменні», «Шэрая раніца» і інш., напісаных смелым мазком, гавораць аб тонкім каларыстычным бачанні маладога мастака, аб яго вялікай здольнасці чула перадаваць стан прыроды і ўласныя перажыванні.

Тонкую перадачу лірычнага «настрою» прыроды мы назіраем у пейзажах і эцюдах артыста Брэсцкага тэатра Ю. Уласава.

У звычайнай дэкаратыўнай манеры выкананы В. Мудрогіным кампазіцыя «На новы аб'ект», пейзаж «Светлая прасека», рад эцюдаў і эскізы да трагедыі Пушкіна «Барыс Гадуноў». Свежыя па каларыту і шырокай манеры пісьма, работы яго, аднак, незавершаны. Цікавыя карціны педагога Іванаўскага раёна А. Рубановіча «Золата заваяванай багны» і «Чэрвень пад вечар» адрозніваюцца філіграннай дэталіроўкай у манеры старых майстроў. Аднак пачуццё меры аберагае мастака ад спаўзання да натуралізму. Дэталь у яго карцінах не засланяе цэласнасці мастацкага вобраза.

Гэтага нельга, на жаль, сказаць пра работы педагога М. Кірава (Кобрынская музычная школа). Захоплены скрупулёзнай штудзіроўкай малюнка і дакладным узнаўленнем дэталей ён часам забывае пра вобразнае абагульненне і ператвараецца ў абыякавага фатографа. Так здарылася з яго графічнымі пейзажамі «Рэчка лясная». Куды больш шчыра гучаць яго іншыя замалёўкі—«Перад навальніцай», «Калгас Калініна», «Марозны дзень», плакаты «Слава XXII з'езду КПСС», «Этапы вялікага шляху»

Сакавітыя па фарбах і выкананню пейзажы «Зімá» і «Вясна» паказаў студэнт з Пружан В. Пініч. З вялікім майстэрствам напісан Э. Тарасевічам з Баранавіч «Эцюд галавы калгасніцы». Прыцягваюць увагу пейзажы слесара з Драгічына В. Яроц «Жыта», «Сасновы бор», «Гай».

Цікавыя работы паказаў вядомы брэсцкі інкрустатар і разбяр Д. Сакажынскі. Сярод іх разны барэльеф Ул. І. Леніна, тонкая мініяцюрка «Першы ўрок», інкруставаная тэматычная шкатулка з відам Холмскіх варот Брэсцкай крэпасці.

Драгічынскі скульптар В. Макуха экспануе абагулены партрэт «Герой Брэсцкай крэпасці» (галава, патынірованы гіпс), «Партрэт дзяўчыны» (галава, патынірованы гіпс) і «Даярка» (бюст, дрэва). Найбольш удалая ў сэнсе псіхалагічнай характарыстыкі «Даярка», хоць адчуваецца, што майстар не зусім яшчэ авалодаў матэрыялам, не знайшоў патрэбных прыёмаў разьбы па дрэву. Але прыемна адзначыць, што В. Макуха працуе ўжо ў матэрыяле (мармур, дрэва), чым не заўсёды могуць пахваліцца і некаторыя прафесіянальныя скульптары.

Парадаваў гледачоў работнік Кобрынскага прамкамбіната, удзельнік партызанскага руху І. Дарафейкін. Яго барэльеф «Яны прайшлі» паказвае момант выхаду з варожага акружэння групы партызан. Нягледзячы на складанасць вырашэння шматфігурнай і шматпланавай кампазіцыі ў рэльефе, аўтару ўдалося ўсё ж пераканальна раскрыць тэму, хоць у працы і адчуваецца незавершанасць, парушэнне заканамернасцей у пабудове рэльефу.

Мастацкае выпальванне па дрэву прадстаўлена работамі брастчаніна С. Старажэнкі. Яго партрэты касманаўтаў Гагарына і Цітова вызначаюцца вялікім падабенствам.

На гэтай выстаўцы бядней прадстаўлены вышыўка і ткацтва. На фоне безгустоўных вышывак крыжыкам, выкананых па збітых трафарэтах—прыемна вылучаюцца мастацкім густам, навізной матываў і майстэрствам два невялікія тэматычныя пано «Куба» і «Дружба народаў». Эскізы для іх зроблены мастаком Брэсцкага дывановага камбіната В. Сенькінай, а выкананы яны брэсцкімі майстрамі вышыўкі — медлабаранткай А. Камаровай («Куба») і кіраўніком гуртка вышыўкі Дома піянераў Ц. Цярцічнай.

З ткацкіх работ варта адзначыць партрэт Ул. І. Леніна, выткані калгасніцай Гарадзішчанскага раёна Е. Яфімовіч, двухбаковы шарсцяны дыван з традыцыйным беларускім раслінным арнаментам работы старой калгасніцы Камянецкага раёна А. Тысянчук, А. Лікута і інш.

Вялікім недахопам у арганізацыі выстаўкі з'яўляецца тое, што амаль палавіна раёнаў вобласці не прынялі ў ёй удзелу, ды і з астатніх раёнаў прадстаўлена далёка не ўсё, што яны маглі б даць. На выстаўцы ў асноўным змешчаны экспанаты ўмельцаў горада Брэста. Такія раёны, як Баранавіцкі, Пінскі, Кобрынскі, Бярозаўскі і нават Брэсцкі, не прадстаўлены зусім, хоць там ёсць многа цікавых майстроў. Не ўдзельнічаюць у выстаўцы вядомыя разбяры па дрэву К. Казелка, І. Лук і іншыя.

Гэта тлумачыцца тым, што многія раённыя аддзелы і дамы культуры не вядуць належнай работы з майстрамі народнай творчасці, не арганізоўваюць раённых выставак.

Арк. СУРСКІ.

Брэст.

ГЕРАІЧНАЕ Ў ЖЫЦЦІ І Ў ЛІТАРАТУРЫ

Творчая трыбуна

У АПОШНІ ЧАС нямала пішуць пра гераічнае ў нашай рэчаіснасці і пра разнастайнасць паказу гераічнага ў творах сучаснай савецкай літаратуры. Наша сучаснасць, калі гераізм стаў масавым і штодзённым, калі гераічныя справы савецкага народа ў камуністычным будаўніцтве, у развіцці навукі і тэхнікі, у асваенні космасу здзіўляюць увесь свет, калі значна выраслі густы чытачоў, іх агульнаадукацыйны ўзровень, патрабуе глыбокага мастацкага асэнсавання, усебаковага і разнастайнага паказу ў творах мастацтва.

Ярка адлюстраваць нашу рэчаіснасць — гэта значыць у першую чаргу стварыць шматгранныя гераічныя характары простых савецкіх людзей, будаўнікоў камунізма.

«Наша мастацтва закліканa глыбока і праўдзіва паказваць нараджэнне подзвігаў, раскрываць духоўны свет нашага сучасніка, яго пачуцці, думы і імкненні» (М. С. Хрушчоў).

У чым сіла савецкага чалавека? Чаму ён здольны на подзвігі? На гэтыя пытанні імкнуцца адказаць савецкія пісьменнікі як у творах пра Вялікую Айчынную вайну, калі ў барацьбе за жыццё і перамогу асабліва ярка выявілася тое, што з'яўляецца сутнасцю характару савецкага чалавека, так і ў творах пра гераічныя будні сучаснасці.

Героіка вайны і працоўных будняў мае адну і тую ж маральна-валявую аснову. Нельга пасапраўднаму зразумець подзвіг савецкага народа ў пасляваенным будаўніцтве без глыбокага асэнсавання цяжкіх выпрабаванняў і велічнай героікі народа ў Вялікай Айчыннай вайне, а ўсенародны гераізм савецкага народа ў барацьбе супраць фашысцкіх захопнікаў — без усведамлення таго, што толькі Савецкая ўлада і Камуністычная партыя здолелі ўзняць раней адсталыя і прыгнечаныя народныя масы да свядомага ўдзелу ў гістарычным працэсе, выхаваць адказнасць кожнага савецкага чалавека за сваю дзяржаву, за будучае чалавецтва.

Толькі такі гістарычны падыход дазваляе нашым пісьменнікам раскрыць сутнасць героікі народа, змест подзвігу як найбольш канцэнтраванага выражэння гераізму. Подзвіг—гэта не істэрычная ўспышка імгненнай мужнасці і храбрасці, а свядомы акт асобы. Савецкі патрыёт прымае важнае рашэнне па закліку душы, але яго гераізм нічога агульнага не мае з «душаўладкаваннем», фанатычнай асалодай самаахвяравання. Яго подзвіг — неабходнае выяўленне сапраўднай чалавечнасці, выражэнне адзінства чалавека і справы, новае «вымярэнне» асобы, выхаванай савецкім ладам, Камуністычнай партыяй. Здольнасць на подзвігі савецкага чалавека абумоўлена ўсім комплексам яго ідэйна-маральных устояў, якасна новым, савецкім патрыятызмам. Савецкі чалавек сваё шчасце знаходзіць у тым, што яго асабістыя імкненні адпавядаюць грамадскім ідэалам, планам пабудовы ў нашай краіне самага светлага і радаснага грамадства — камунізма. Агульнанародныя інтарэсы становяцца для яго такімі блізкімі, важнымі, асабістымі, што для дасягнення агульнанароднай мэты герой здольны пераадолець любыя цяжкасці і перашкоды, прайсці праз самыя суровыя выпрабаванні. Такое зліццё агульнанародных і асабістых інтарэсаў з'яўляецца асновай гераізму і подзвігаў савецкіх патрыётаў.

Мы лічым, што патрабаванне да савецкіх пісьменнікаў мацаваць сувязь з нашым бурлівым жыццём, быць заўсёды ў яго вірах, глыбока і праўдзіва паказваць шматгранныя гераічныя характары, вытокі гераізму савецкіх людзей робіць бязмэтнымі тэарэтычныя спрэчкі некаторых крытыкаў (С. Штут, Л. Скарына, Б. Салаўёў і інш.) аб тым, дзе заканчваецца гераічнае і пачынаецца абыдзённае, ці стала ўсё штодзённае гераічным, калі гераічнае стала масавым, існуе ў штодзённым, аб тым, як паказваць у літаратурных творах гераічнае і абыдзённае і г. д. Само патрабаванне шматграннасці характараў мае на ўвазе творы не з «вытворчай» і не з вузка «камернай» тэмамі, а глыбока сацыяльныя творы, прасякнутыя вялікімі ідэямі сучаснасці, праваднікамі якіх і з'яўляюцца гераічныя вобразы, паказаныя як у працы, так і ў побыце, у цеснай сувязі з іншымі вобразамі.

Не паралельнае існаванне гераічнага і штодзённага, а ўзаемаабумоўленасць і дыялектычная ўзаемасувязь аднаго з другім, пры якой гераічнае, як правіла, вынікае са штодзённага, звычайнага, бо ў штодзённых справах савецкіх людзей раскрываецца гераічная прырода нашага грамадства. Разам з гэтым, мы не ставім знака роўнасці паміж гераічным і абыдзённым. Калі кожны крок, учынак героя, які не мае важнага значэння для агульнаграмадскіх інтарэсаў, падганяецца пад мерку гераічнага, то гэта можа прывесці пісьменніка да стварэння вобразаў ілжэгерояў. Просты савецкі чалавек здольны на подзвіг, але гэтая здольнасць выяўляецца не заўсёды, выяўляецца па-рознаму ў кожнага чалавека. Калі ж пісьменнік адбірае права ў простага савецкага чалавека быць героем, то з'яўляюцца вобразы людзей, якія жывуць у баку ад велічных спраў нашай эпохі, якія не здзяйсняюць за сваё жыццё нічога высакароднага, значнага, не пакідаюць ніякага следу ў жыцці. І тым не менш на такіх герояў часта навешваюць бірку з атэстацыяй: звычайны, ардынарны герой, вобраз простага чалавека. Такі натуралістычны падыход не адлюстроўвае ўсяе праўды нашага жыцця, не адпавядае асноўным патрабаванням сацыялістычнага рэалізму, прыводзіць да таго, што гераічнае знікае са старонак некаторых твораў.

Праблема станоўчага героя — праблема метадалагічная. Праз адносіны пісьменніка да вобразаў выяўляюцца яго погляды на рэчаіснасць, яго жыццёвы і сацыяльны вопыт, палітычныя перакананні, яго эстэтычны ідэал. У творы важна не толькі тое, аб чым піша аўтар, але і тое, як ён аб гэтым піша, каб паказаць нашу гераічную аб'ектыўную рэчаіснасць праз сваё творчае суб'ектыўнае ўспрыйманне.

Здавалася б, што прадметам мастацкага адлюстравання ў аповесці Я. Брыля «Апошняя сустрэча» стаў далёка не гераічны матэрыял, «камерная» тэма кахання, вернасці і г. д. Але гэта не так. За галоўнымі вобразамі аповесці стаяць праблемы нашай рэчаіснасці, бачны прыкметы нашага гераічнага часу, адчуваецца пульс нашай сучаснасці, ідзе барацьба дзвюх ідэалогій — мяшчанска-буржуазнай і камуністычнай.

У раманах Ул. Карпава («За годам год», «Вясеннія ліўні») паказваюцца нашы сучаснікі, індустрыяльная Беларусь. Але героі Ул. Карпава не задавальняюць нас у поўнай меры як шматгранныя вобразы гераічных людзей. Пісьменніку часта нестае мастацкай культуры ў паказе псіхалогіі людзей, нестае палымянай наступальнасці супраць усяго таго, што перашкаджае нашаму руху наперад.

Наогул паказ героікі без глыбокага пранікнення ў яе сутнасць і змест, без раскрыцця яе маральна-валявой асновы характэрны для многіх сучасных беларускіх твораў як аб Вялікай Айчыннай вайне (аповесці «Людзі прагнуць» М. Лупсякова, «З табою побач» М. Паслядовіча, «Над намі навальніцы» Н. Галузы і г. д.), так і аб нашай сучаснасці (аповесць М Ваданосава «Пераломнае лета», большасць апавяданняў зборніка І. Дуброўскага «Паўз самыя вокны», нарысы С. Грахоўскага, Т. Хадкевіча аб Полацкім нафтабудзе і г. д.).

У апошнія гады напісана нямала твораў аб вайне, у якіх пісьменнікі на аснове творчага асэнсавання лепшых здабыткаў літаратуры ваеннай тэмы сказалі сваё, новае і свежае, мастацкае слова аб героіцы народа. Галоўную тэндэнцыю развіцця літаратуры аб вайне можна вызначыць як імкненне да больш глыбокага і падрабязнага, аналітычнага раскрыцця псіхалогіі савецкага воіна, партызана, падпольшчыка, яго маральна-валявой сілы, як жаданне канчаткова пазбегнуць павярхоўна-спрошчанага, наіўна-рамантычнага паказу ваенных дзеянняў, гераізму савецкіх людзей. Імкненне бліжэй падыйсці да тых людзей, якія вырашалі лёс вайны, зазірнуць у іх душу ў самыя цяжкія дні, паказаць усяму свету яе казачнае багацце, эмацыяльную шматграннасць характэрна для такіх твораў, як раман «Жывыя і мёртвыя» К. Сіманава, аповесць «Апошнія залпы» Ю. Бондарава, раман «Чалавек і зброя» А. Ганчара, аповесць «Агонь і снег» І. Шамякіна, раман «Вайна пад стрэхамі» А. Адамовіча і іншыя. Пісьменнікі ўспрыймаюць падзеі гераічнага мінулага праз прызму нашага сучаснага гістарычнага і духоўнага вопыту, праз прызму сённяшніх дзён — дзён камуністычнага будаўніцтва ў нашай краіне, умацавання лагера міру і сацыялізма, пашырэння інтэрнацыянальных сувязей працоўных усяго свету, разгортвання напружанай барацьбы супраць новай вайны.

Літаратура аб вайне набывае новы сэнс і задачы: «Пісьменнікі, кожны па меры сваіх сіл і свайго вопыту, агульнай творчай працай ствараюць эпапею ўсенароднай барацьбы за свабоду і незалежнасць Радзімы. Такая эпапея павінна быць праўдзівай, усёабдымнай і аналітычнай, здольнай ярка расказаць будучым пакаленням аб подзвігу іх папярэднікаў, здольнай выхаваць — у першую чаргу моладзь—у духу высокага патрыятызму, вернасці ўсяму таму, што дорага і свята для народа» (В. Лаціс).

Савецкая літаратура аб вайне гераічная па сваёй прыродзе, але пісьменнікі па-рознаму бачаць і паказваюць падзеі вайны, гераізм савецкіх патрыётаў. З багатай і шматграннай тэмы пісьменнік вылучае тыя яе бакі, якія дазваляюць яму сказаць сваё слова аб вайне, скласці сваю песню аб героіцы народа.

Паказваючы штодзённую масавую героіку або асобныя подзвігі савецкіх патрыётаў — мабілізацыю і канцэнтрацыю ўсіх духоўных і фізічных сіл асобы ў адным парыве, лепшыя савецкія пісьменнікі адлюстраванне гераізму не зводзяць да апісання толькі знешняга, колькаснага боку падзей, яны імкнуцца да раскрыцця самога зместу подзвігаў, да паказу героікі не ўшырыню, а ўглыбіню. І гэтая тэндэнцыя з'яўляецца плённай у распрацоўцы тэмы гераізму нашымі пісьменнікамі.

МЕТАД сацыялістычнага рэалізму забяспечвае неабмежаваныя мажлівасці для развіцця розных форм і стыляў савецкай літаратуры, для адлюстравання праўды жыцця, героікі народа рознымі спосабамі. Справа не ў тэарэтычных спрэчках, які стыль лепшы (у апошні час часта раздаюцца галасы супраць рамантычнага стылю за рэальна-бытавы стыль, супраць мастацкага завастрэння за ўсебаковы псіхалагічны аналіз і г. д.), а ў тым, ці дазволіла аўтарская творчая манера і мастацкі індывідуальны стыль глыбока раскрыць у творы сутнасць з'яў, характар нашых сучаснікаў, даць жыццёвыя, хвалюючыя вобразы.

Адны пісьменнікі, як правіла, апісваюць гераічныя справы савецкіх патрыётаў дзень за днём, раскрываюць гераізм будняў, другія — адлюстроўваюць самыя яркія моманты з жыццёвай плыні, асабліва драматычныя канфлікты, паказваюць характары ў асноўным толькі ў вузлавых, пераломных пунктах іх развіцця.

У рамане «Вайна пад стрэхамі» А. Адамовіч абгрунтавана паказаў здольнасць простага савецкага чалавека, калі ён савецкі па сутнасці, на гераічныя справы, на подзвігі. Пісьменнік выяўляе гераічнае ў штодзённай, але такой адказнай і небяспечнай дзейнасці, як жыццё і барацьба падпольшчыкаў і партызан у акупіраваным фашыстамі беларускім сяле. Нават раскрываючы трагічнае аблічча вайны, А. Адамовіч пастаянна і настойліва ўказвае на гераічную, жыццесцвярджальную праўду Айчыннай вайны, якую нясуць мужныя і стойкія героі.

Эстэтыка прастаты і штодзённасці з'яўляецца прынцыпам, пакладзеным аўтарам у аснову сваёй кнігі. Героі А. Адамовіча (Ан-

СТУДЭНТЫ — САЎГАСУ

Спакойна і рытмічна працуе трактар «Беларусь». Матор гэтай паслухмянай ва ўмелых руках машыны гудзе больш натужна, калі барабан малатарні захліпаецца ад вялікай нагрузкі. Гэта студэнты Мінскага мастацкага вучылішча малоцяць жыта ў саўгасе «Апчуга» Крупскага раёна. Пасля палітры і кісці не так лёгка ўпраўляцца ля малатарні, але моладзь не адступае, працуе старанна, з ахвотай. Юнакі скідваюць неабмалочаныя снапы, падаюць іх у барабан, а потым адкідваюць салому, складваюць у сціртыі. Аўтамашыны са свежым збожжам адвозяць яго ў засекі саўгаса.

Студэнты былі заняты не толькі на малацьбе. Яны дапамагалі ўбіраць бульбу, кукурузу, буракі.

А надвячоркам будучыя мастакі пісалі эцюды маслам, акварэллю, рабілі замалёўкі алоўкам і тушшу. Увечары, пасля працы, студэнты ішлі ў сельскі клуб. Валерый Аляшкоўскі і Алег Хахлоў ігралі на акардэоне песні і народныя танцы. Далёка за поўнач спявала, весяліла моладзь.

Два тыдні працы ў саўгасе праляцелі хутка. Настаў дзень ад'езду. Рабочыя саўгаса «Апчуга» цёпла дзякавалі студэнтам за дапамогу. Юнакі і дзяўчаты вярнуліся ў роднае вучылішча ўзбагачаныя новымі ўражаннямі, з альбомамі новых замалёвак. Вось некаторыя з іх, што я зрабіў у саўгасе: студэнты на малацьбе. А гэта — малочнатаварная ферма саўгаса «Сорак год Кастрычніка» і новая бальніца саўгаса «Апчуга».

Тэкст і малюнкі **Д. Маслава**, студэнта Мінскага мастацкага вучылішча.

Сцэна з балета «Мара».

КАМПАЗІЦЫІ, ПАРТРЭТЫ, ЭЦЮДЫ

На выстаўцы твораў народных умельцаў у Магілёве экспануецца больш 600 работ жывапісу, графікі, ткацтва, інкрустацыі, мазаікі, разьбы па дрэву і каменю, вышыванню. Сярод іх — жывапісныя кампазіцыі, якія адлюстроўваюць тэмы працы савецкага народа, барацьбу за мір. Многія з іх прысвечаны роднай прыродзе, перадавікам прамысловасці, сельскай гаспадаркі.

Папулярнасцю на выстаўцы карыстаецца мазаіка С. Вольскага «Сцяганосец міру» — партрэт М. С. Хрушчова, выразаная студэнтам Н. Паляковым з дрэва вялікая скульптура Фідэля Кастра, барэльеф Юрыя Гагарына — рабочага Глускага райпрамкамбіната М. Ячмянькова і многа іншых.

Н. Булгакоў (Глуск) прысвяціў сваю карціну будням сямігодкі. Паказаны маладыя даяркі з поўнымі бідонамі малака. Самадзейны мастак з Бабруйска В. Пінчук намаляваў партрэт Героя Сацыялістычнай Працы, даяркі калгаса «Перамога» Бабруйскага раёна А. Сакун.

І. Сітнікаў, В. Лукашэвіч з Магілёва і іншыя ў сваіх карцінах адлюстравалі будні роднага горада. Яны экспануюць творы «Магілёў індустрыяльны», «Новабудоўлі Магілёва», «Магілёўская прыстань» і інш.

На выстаўцы ёсць многа плакатаў на тэму сучаснасці, партрэтаў, эцюдаў і інш. экспанатаў.

У параўнанні з мінулым годам народныя ўмельцы Магілёўшчыны прадставілі значна больш работ. З'явіліся новыя імёны такія, як Абрамаў, Луцук, Красноў, Лукашэвіч, Клімаў, Федарэнка.

Шмат цёплых слоў выказалі наведвальнікі аб выстаўцы ў кнізе водгукаў.

І. КРЫЖЭВІЧ.



ЧАСОПІСЫ У КАСТРЫЧНІКУ

«ПОЛЫМЯ»

«Будучыня становіцца явай» — так называецца артыкул С. О. Прытыцкага, якім адкрываецца кастрычніцкі нумар часопіса «Полымя».

Надрукаваны у нумары вершы Антона Бялевіча, Івана Леткі, Алеся Бачылы, Рыгора Семашкевіча, Сяргея Грахоўскага, Нічыпара Чарнушэвіча, Хаіма Мальцінскага, Рыгора Барадуліна. Публікуецца падборка новых вершаў Аркадзя Куляшова.

Проза прадстаўлена апавяданнямі Міхася Стральцова «Суседзі» і Уладзіміра Дамашэвіча «Дзявочая клятва». Надрукавана заканчэнне рамана Івана Мележа «Людзі на балоце».

Пад рубрыкай «Нарысы» — заканчэнне дакументальнай аповесці І. Новікава «Руіны страляюць ва ўпор» і нарыс Р. Кобеца «Простая біяграфія» — пра свінара саўгаса «Брэсцкі» Сцяпана Гуля.

Надрукаван артыкул Ул. Юрэвіча «Сучаснасць і майстэрства».

Змешчана ў часопісе і некалькі рэцэнзій. Сярод іх — рэцэнзія М. Яроша на зборнік Ул. Дубоўкі «Палеская рапсодыя»; Н. Перкіна — на кнігу М. Гроднева «За бацькоўскім парогам»; С. Александровіча — на кнігу Д. Фактаровіча «Беларуская савецкая літаратура за мяжой»; Я. Герцовіча— на манаграфію М. Луферава «Проза Кузьмы Чорнага».

Надрукавана некалькі кароткіх рэцэнзій, а апошнія старонкі, як звычайна, займае хроніка культурнага жыцця рэспублікі за месяц.

Пісьменнікі едуць на цаліну

Днямі ў цалінны край выехала брыгада паэтаў Савецкай Беларусі.

Р. Няхай, Н. Кіслік, В. Тарас, А. Пысін, І. Шклярэўскі выступяць з чытаннем сваіх вершаў, раскажуць пакарыцелям цаліны пра жыццё і поспехі працоўных нашай рэспублікі.

Брыгада прабудзе ў паездцы каля месяца.

ДЫСПУТУ НЕ АДБЫЛОСЯ

У цёмным кутку цеснага пакойчыка шыюць распашонкі для дзіцяці дзве сяброўкі. Яны вельмі верылі ў чыстае, бескарыслівае пачуццё, і абедзве былі ашуканы ў самым патаемным—у каханні. Вера адной з іх каштавала дорага: яна стала маці, дзіця якой ніколі не будзе ведаць свайго бацькі... Маладыя жанчыны сядзяць сумныя, прыціхлыя. Што рабіць, як жыць далей?..

І раптам сюды прыходзіць сціплы, але непрымірымы да пошласці малады чалавек. Гэта Герман. Погляд яго суровы і рашучы. Але за суровасцю тоящца мяккасць і цеплыня сэрца, яснасць думкі, сіла волі, мэтанакіраванасць. Герман прапануе Ніне паехаць разам з ім у далёкія, незведаныя землі Сібіры, каб там будаваць новае жыццё і шукаць сваё шчасце. Гэтага Ніна не чакала, і не таму, што ёй трэба пакінуць працу ў любімым Ленінградзе, і не таму, што на яе руках грудное дзіця, а найперш таму, што яна, па сутнасці, не ведае юнака. І Герман яе не ведае. Ён ведае толькі, што жанчыну пакінуў яго былы сябра Валерый, што яна—маці. І ёй цяпер вельмі цяжка. Герман пакутліва перажывае трагедыю Ніны, гнеўна рэагуе на агідны ўчынак Валерыка і, не задумваючыся, катэгарычна прапануе... Не, не руку і сэрца, і нават не проста дапамогу, а разумнае выйсце: не паддавацца гору. змагацца з ім. Гэтая прапанова гучыць як заклік сэрца, сумлення маладога чалавека. І вось ужо скоры поезд імчыць Ніну з дзіцем і Германам да новага жыцця, да новых здзяйсненняў, да шчасця. Глядач радуецца за гераіню. Радуецца і... толькі?..

«Провады белых начэй» В. Панова назвала п'есай-дыспутам. І вось дыспут завяршыўся. А, уласна, ці быў гэта дыспут? Што новага сказалі гледачу аўтар п'есы В. Панова і рэжысёр спектакля ў Рускім тэатры імя М. Горкага Р. Віктараў? Новага, што адпавядала б духу часу, сённяшнім імкненням нашай моладзі, у творы вельмі мала. Гэта новае відаць толькі ў прыведзенай сцэне, якая хвалюе прыгажосцю душы нашага сучасніка, простага маладога чалавека. Шчырасць і высакароднасць пачуццяў Германа (арт. І. Камароў), трывога і сумненне, якія пераходзяць у бурнае захапленне і надзею ў Ніны (арт. Э. Аўчыннікава), вабяць сапраўднай усхваляванасцю.

І. Камароў і Э. Аўчыннікава жывуць на сцэне жыццём сваіх герояў. Першы напачатку здаецца нават крыху смешным з-за сваёй нязграбнасці. Вузкі пінжачок з кароткімі рукавамі, з якіх вытыркаюць грубаватыя, але надзейныя і ласкавыя рукі, падкрэслівае гэта. У яго задуменным поглядзе адчуваеш сілу і мужнасць. Толькі ў сцэне выкрыцця Валерыка перад Тамарай артыст не знайшоў яркага выяўлення самаадчування, матывіроўкі паводзін свайго героя. Ён раптам нібы стамляецца ад барацьбы і ледзь не адступае перад хлуснёй і двудушнасцю Валерыка. Гэтая сцэна рэжысёрскі не завершана, яна нібы павісла ў паветры.

Уменне пераўвасабляцца робіць выкананне Э. Аўчыннікавай ролі Ніны ў першым акце натхнёным, сцэнічна яркім, выразным. Сцэны знаёмства з Валерыкам поўныя прывабнасці і добрага гумару. Нясмелае дзявочае пачуццё, якое толькі што ўзнікла, перарастае ў моцнае каханне. І вельмі крыўдна, што ў наступных сцэнах актрыса не ўзбагачае вобраз. Асабліва гэта характэрна для паводзін Ніны ў сцэне з Кірай—Е. Біруковай, сцэне сухой, сумнай, надакучлівай. Але віна тут не столькі выканаўцаў, колькі аўтара п'есы і рэжысёра спектакля. В. Панова паставіла сваіх гераінь у малаверагодныя абставіны, а рэжысёр не знайшоў мастацкага вырашэння гэтай сцэны. Прасталінейнасць разважанняў Кіры і празмерныя павучанні ў вуснах Ніны фальшывыя і сумныя. Ім не верыш. Жывое арганічнае дзеянне, канфлікт падменены ў п'есе і спектаклі маралізатарскімі сентэнцыямі, сентыментальнасцю.

Дарэчы, сентыментальнасць уласціва ўсяму твору В. Пановай і замянае сур'ёзнай размове—дыспуту аб каханні, аб шляхах нашай моладзі ў жыцці, яе творчых пошуках, дзярзаннях, памылках і сумнеўнях. Нейкую празмерную чуллівасць рэжысёр не толькі не пераадолеў, але яшчэ больш падкрэсліў.

Гэта і перашкодзіла творчаму калектыву тэатра перайсці ў «Провадах белых начэй» межы звычайнага, сярэдняга спектакля. У ім не адчуваецца святочнага, прыўзнятага настрою. І самой урачыстасці провадаў белых начэй глядач не адчувае: ні танцавальная музыка, ні пары, што сумуюць у вальсе, ні яркія паветраныя шары і прыгожыя кветкі ў прадаўцоў не паляпшаюць становішча. У самым спектаклі закладзены празмерны сум, туга, песімістычная інтанацыя.

Ад вонкава прыгожага сілуэта вялікага горада з яго велічнымі набярэжнымі (мастак А. Грыгар'янц) павявае тым жа сумам і холадам. Прыгожая панарама, якая займае вялікую прастору сцэны, становіцца назойлівай, таму што яна часцей пустае, чым служыць арэнай вострых сутыкненняў герояў. Дзеянне п'есы, увесь яе канфлікт рэжысёр і мастак чамусьці загналі ў куткі сцэны, у самыя кулісы. Спектакль у асноўным праходзіць на маленькіх пляцовачках, дзе двум акцёрам нельга павярнуцца, і гэта пакідае ўражанне здробненасці, штучнасці. Для акцёраў і падзей, здаецца, не хапае паветра, прастору для іх самых звычайных рухаў.

Нельга, вядома, ад кожнага мастацкага твора патрабаваць просталінейных адказаў «так» або «не», ды яшчэ да таго ж на пытанні маралі, узнятыя ў п'есе В. Пановай. Каштоўнасць п'есы ў тым, што яна дае прастор для роздуму над жыццёва важнымі этычнымі праблемамі. Аўтар, відаць, меў намер выклікаць гледачоў на востры і прычцыповы дыспут, на сур'ёзную размову. Але гэтага якраз не адбылося на спектаклі. Не адбылася перш за ўсё таму, што, уласна, спрачацца няма аб чым.

Так, у жыцці маладых многа розных дарог. І па кожнай з іх ісці не заўсёды бывае лёгка і проста: адзін ідзе проста і ўпэўнена, другі нярэдка спатыкаецца і нават падае. Кажуць: жыццё пражыць—не поле перайсці. Усё гэта так, але ўвогуле. А канкрэтна? Што прапануе гледачу аўтар п'есы ў якасці канфлікту? Лавелас і дармаед Валерык спакушае дзяўчыну Ніну і, узяўшы ў яе ўсё аж да апошняга рубля, пакідае з дзіцем на руках ашуканай, прыніжанай.

Якая ж мараль такога канфлікту? Кожны з маладых гледачоў, не задумваючыся, адкажа: падобным прайдзісветам не месца ў нашым грамадстве, бо яны перашкаджаюць нам будаваць светлае і шчаслівае жыццё. Іх трэба сур'ёзна лячыць. Хто ж і аб чым тут стане дыскуціраваць! Наўрад ці знойдзецца ў глядзельнай зале чалавек, які проста або ўскосна паспрабаваў бы абараняць агідныя паводзіны Валерыка. Не, не знойдзецца сярод нашай моладзі такога юнака ці дзяўчыны. Хутчэй знойдзецца такі, што паспачувае або асудзіць празмерную даверлівасць Ніны. Але гэта, думаецца нам, зноў-такі не з'яўляецца тэмай для дыспуту шырокага грамадскага гучання.

Да таго ж многае ў п'есе нагадвае старую, даўно абрыдлую меладраматычную сітуацыю, бачаную ў дзесятках меладрам і фельетонаў. Што прынцыпова новага ў вобразах Ніны, Жаны, Валерыка і Віктара?

Дыспут пасля спектакля не адбыўся яшчэ і таму, што сэнсавыя і мастацкія акцэнты і ў п'есе, і ў спектаклі пастаўлены не зусім правільна. Брыдкі і нікчэмны бязлівец Валерык, у праўдзівым шчырым выкананні Ю. Сідарава пададзены ў развіцці, і яго дастойная пара—выхаленая і выпеставаная прыгажуня Тамара ў сцэнічна яркай і дакладнай трактоўцы Б. Масумян у выніку апраўдваюцца: Валерык пазбягае калі не юрыдычнага, дык хаця б маральнага грамадскага асуджэння, яго шлях вянчаецца шчаслівым саюзам у палацы рэгістрацыі шлюбаў.

Пакаранымі аказаліся Ніна і Жана—дзве бескарыслівыя ў дружбе і каханні сяброўкі, сумленныя працаўніцы, ахвяры празмернай даверлівасці да людзей, якая ледзь не зацягнула іх у павуцінне пошласці і бруду. У п'есе і спектаклі ўсё створана для таго, каб пакараць іменна іх. І як ні радуецца Ніна — Аўчыннікава прапанове Германа паехаць, як ні кранальная ў сваёй вялікай вернасці сяброўцы Жана ў Г. Значкоўскай,—адчуванне крыўды і жалю да іх не пакідае гледача.

Струмень здаровага аптымізму, бадзёрага стаўлення да жыцця, добрай дзелавітасці ўносяць выканаўцы вобразаў Косці і Зіны артысты А. Бялоў і З. Асмалоўская. Але гэтыя вобразы ў вырашэнні канфлікту п'есы не такія значныя, каб абудзіць у гледача пачуццё аптымізму. Такое пачуццё з'яўляецца толькі ў самым фінале спектакля—у мітусні адыходзячага поезда, шумных провадаў. Але пра гэтую канцоўку хутка забываеш. Думка ж пра лёс Ніны, галоўнай гераіні п'есы, доўга яшчэ непакоіць гледача. І для яе дакладнага і праўдзівага раскрыцця сцэнічнымі сродкамі тэатру варта больш папрацаваць.

А. БУТАКОЎ.

ПІСЬМЫ Ў РЭДАКЦЫЮ

АБЫЯКАВАСЦЬ ДА ВАЖНАЙ СПРАВЫ

Кінафікатары Светлагорскага раёна сёлета за дзевяць месяцаў выканалі гадавы план абслугоўвання сельскага насельніцтва на 126 працэнтаў.

Вынікі маглі быць значна лепшыя, каб дырэкцыя саўгаса «Парычы» больш чула ставілася да важнай справы, якой з'яўляецца кіно.

На тэрыторыі саўгаса 20 вёсак, аднак у іх працуюць толькі дзве кінаперасоўкі. У Кнышэвічах, Майсееўцы, Данілаўцы, Круках ёсць клубы, але там няма кінаапаратных.

— Прыедзеш у вёску,—расказвае кінамеханік Віктар Дзікун,— і думаеш, дзе паставіць кіно. У клубе нельга: пажарная ахова не дазваляе. У школе настаўнікі пярэчаць. Просім дзядзьку, каб пусціў у хату.

Дырэкцыя саўгаса ведае, што ў хаце нельга паказваць кіно. Чаму ж няма кінаапаратных, не будуюць клубаў? Дырэктар саўгаса тав. Шульга і сакратар парткома тав. Калейчык заяўляюць, што ім на гэта грошай не адпускаюць.

Мала клапоціцца пра адпачынак хлебаробаў і праўленне калгаса імя Кірава. У вёсцы Успалішчы ёсць клуб, але ў ім кіно не ставіцца. Зімой у клубе холадна, а летам захоўваецца збожжа.

У горадзе Светлагорску кінафільмы дэманструюцца ў трох клубах, якія належаць прафсаюзным арганізацыям. Не ўсім удаецца паглядзець той ці іншы фільм, не хапае месца. Гораду патрэбны прасторны кінатэатр.

С. ПРАЧ.

КАЛІ ЗАКОНЧЫЦЦА РАМОНТ?

Пяць месяцаў назад рашэннем Мінскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных Вілейскай гарадской бібліятэцы было перададзена памяшканне былога кінатэатра «Кастрычнік». Маладзечанская рамонтна-будаўнічае ўпраўленне павінна было пачаць рамонт памяшкання. Але прарабы тт. Рабцоў і Страшынскі не турбуюцца аб своечасовай дастаўцы будаўнічых матэрыялаў. У выніку рамонт зацягваецца. За два мінулыя месяцы рабочыя паспелі толькі разабраць пераборкі, пакласці лагі і зрабіць палавіну печы. Хацелася б спытаць у кіраўнікоў рамонтна-будаўнічага ўпраўлення, колькі ж патрабуецца часу, каб закончыць усе работы?

А. ШАПШАЛЕВІЧ,
загадчыца Вілейскай гарадской бібліятэкі.

Творчыя калектывы — да з'езда

З выключным натхненнем рыхтуецца да XXII з'езда КПСС Дзяржаўны ансамбль танца БССР.

На гэтых здымках фотакарэспандэнты М. Рубінштэйн і С. Чырэшкін адлюстравалі украінскі танец «Гапак» (унізе) і «Свята ўраджаю», у якім удзельнічаюць былыя работніцы Мінскага камбіната Галіна Сабакевіч і Тамара Елісеева. Цяпер яны артысты ансамбля.



на Міхайлаўна, Надзя, Аляксей, Павел, Іван Каваленка і інш.)— самыя звычайныя савецкія людзі, а іх штодзённая героіка—гэта цяжкая праца, якая патрабуе выключнага напружання нервовай, фізічнай і разумовай энергіі.

Раман «Вайна пад стрэхамі» сведчыць аб культуры творчасці, высокім майстэрстве маладога раманіста. У рамане адсутнічаюць вобразна-стылістычныя штампы. Арыгінальнасць і трапнасць мастацкіх сродкаў, яркі моўны каларыт, філігранная апрацоўка фразы—вось што можна сказаць аб мастацкім стылі А. Адамовіча. Асабліва ўдалымі і праўдзівымі з'яўляюцца шырокія параўнанні, яны характарызуюцца прадметнай канкрэтнасцю. Чытач лёгка ўспрымае сувязі, асацыяцыі паміж прадметамі, дэталямі, з'явамі, якія паказваюцца, і параўнаннямі, якія дапамагаюць наглядна, аб'ёмна ўбачыць прадмет, вобраз, зразумець яго сутнасць, аўтарскія адносіны да яго. Страсная аўтарская ацэначнасць асабліва ярка выяўляецца ў дакладнай абмалёўцы вобразаў ворагаў і іх памочнікаў. Прывядзём некалькі прыкладаў. «Ўлыбка проступила на лице Пуговицына, крепко стянутом кожаным летным шлемом. Так проступает болотная вода под тяжестью ноги. И так улыбается человек—из глубины, мечтательно, слушая музыку. Плач испуганной женщины—о, Пуговицын умеет это слушать. И он любит растянуть удовольствие». «Жигоцкая ласково тянулась губами, узеньким носом, всеми морщинами широкого желтого лица к теще начальника полиции. В эту минуту она была удивительно похожа на тяжелую черепаху, которая вытягивает голову вперед, будто не в силах сдвинуть с места свой панцырь». «Офицер поглядел на толпу, потом на тех в штатском, что стояли рядом с ним, и улыбка сползла с его лица, как кожица с гнилого яблока. Лицо потемнело, в глазах промелькнула растерянность». Сапраўдная вобразнасць характэрна для ўсяго апавядання, аўтарскіх адступленняў, ваенна-гістарычных абагульненняў у рамане. «Война! Вчера еще такое незаметное среди других слов, обращенное в книжное прошлое и неопределенно далекое будущее, слово это вдруг ожило, встало, как плотина, поперек всех мыслей, желаний, чувств мальчугана». Вось яшчэ апісанне патоку бежанцаў: «Кажется, что ночью во время сна чья-то чудовищная рука сгребла людей с огромной территории и швырнула их на землю, и вот те, что уцелели, разбредаются, сами не зная куда».

Выяўленне гераічнага ў штодзённым суровым ваенным жыцці характэрна і для аповесці І. Шамякіна «Агонь і снег». Апавяданне ў творы вядзецца ад імя галоўнага героя — Пятра Шапятовіча. Дзённік героя — гэта яго споведзь перад сваім сумленнем, сумленнем воіна і камандзіра. Даваеннае ўяўленне героя аб вайне, яго наіўна-рамантычная мара аб воінскім подзвігу не мелі нічога агульнага з той суровай вайной, якую ўбачыў сваімі вачыма герой. Цяжка было чалавеку, жыццё якога праходзіла ў мірнай творчай працы, перамагчы страх смерці. У складаных і жорсткіх ваенных умовах Шапятовіч авалодваў баявым вопытам, вучыўся падпаракоўваць пачуцці страху сваёй волі, якую мацавала глыбокае ўсведамленне патрыятычнага абавязку. І гэта паказана ў аповесці сапраўды пераканаўча, праўдзіва.

І. Шамякіну не патрэбна было «ўжывацца» у вобраз героя, ён сам усё гэта перажыў у час вайны, а яго сённяшняя чалавечая і пісьменніцкая сталасць дапамаглі выбраць галоўнае з душэўнага жыцця чалавека на вайне. І. Шамякін пісаў: «Вайна была жорсткай, але разам з гэтым вялікай школай — мы пазнавалі жыццё і чалавечыя характары ў самых драматычных сітуацыях, якія да канца раскрываюць душы людскія». Малюнкі ваеннага жыцця ў аповесці «Агонь і снег» напоўнены глыбокім роздумам, памяць сэрца пісьменніка дапоўніла строга рэалістычныя малюнкі тонкім лірызмам успамінаў. Дзённікавая форма як найлепш адпавядае таму рэальнаму зместу, які стаў прадметам мастацкага адлюстравання для І. Шамякіна. Гэта ж можна сказаць і пра своеасаблівую форму рамана А. Адамовіча «Вайна пад стрэхамі».

Аповесць І. Шамякіна і раман А. Адамовіча гавораць аб высокай культуры псіхалагічнага аналізу. Наогул культура псіхааналізу—добрая якасць шматлікіх сучасных твораў прозы. Гэта адносіцца, хоць і ў рознай ступені, да твораў Я. Брыля, В. Быкава, Я. Скрыгана, А. Чарнышэвіча, Б. Сачанкі і інш. Наглядаецца імкненне і ў вялікіх творах пазбавіцца фармальнай манументальнасці, эпапейнасці як вонкавых прыкмет «вялікіх раманаў», калі аб'ём твораў вялікі, а ёмістасць зместу непамерна малая. Аб гэтым гаворыць яшчэ не закончаныя мастацкія палотны — «Людзі на балоце» І. Мележа, «Серадзібор» П. Пестрака, «На парозе будучыні» М. Лобана. Для гэтых раманаў характэрна сапраўдная эпічнасць і псіхалагізм, жыццё народа ў іх паказваецца праз гістарычна праўдзівыя вобразы, на глыбока гістарычнай аснове.

Становіцца зусім відавочнай памылковасць супрацьпастаўлення «экстэнсіўнасці», эпічнасці, сінтэтычнасці рамана, яго «інтэнсіўнасці», глыбокаму паказу жыцця, «мікрасвету» на малой прасторы, на невялікім адрэзку часу. Шырыня ахопу рэчаіснасці апраўдана ідэйна і эстэтычна, калі з яе дапамогай пісьменнік здолеў глыбока, наглядна раскрыць сутнасць людзей і падзей.

П. Пестрак ужо ў сваёй першай кнізе рамана стварыў яркія гераічныя вобразы нашых сучаснікаў (Кляновіч, Малашкін і г. д.). Шырока адлюстроўваючы падзеі першых пасляваенных гадоў, аднаўлення зруйнаваных калгасаў, пісьменнік пераканаўча раскрыў ідэйную стойкасць, выключную дзейнасць сваіх герояў у барацьбе з сапраўднымі цяжкасцямі.

У раманах П. Пестрака, І. Мележа, М. Лобана паказваюцца падзеі, у той або іншай меры аддаленыя ад нашых дзён, але гэтыя творы напісаны з пазіцый сучаснасці, праекнуты сапраўдным гістарызмам. Гэта становіцца асабліва відавочным, калі параўнаць творы, напісаныя аб адных і тых жа падзеях рознымі пісьменнікамі ў розны час, напрыклад, раманы «Пад мірным небам», «Шырокія гарызонты» А. Стаховіча і раман П. Пестрака «Серадзібор». І справа тут не толькі ў культуры псіхалагізму, а і ў самім падыходзе да мастацкай праўды жыцця, адлюстравання нялёгкіх гераічных намаганняў народа па аднаўленню разбуранай гаспадаркі, у іншых патрабаваннях да сучаснай літаратуры.

Дэталёвы псіхалагічны аналіз, калі адсутнічае пачуццё меры, мастацкага адбору, мае як моцныя, так і слабыя бакі. Ён можа прывесці да таго, што думкі, пачуцці героя будуць разглядацца ў адрыве ад навакольнага, ад гераічных падзей, у якіх ён удзельнічае сумесна з іншымі героямі. Залішняе захапленне некаторых пісьменнікаў душаўладкаваннем сваіх герояў, маральна-этычнымі праблемамі прыводзіць да змяншэння палітычнага напалу, зніжэння пафасу ў паказе гераічных спраў савецкіх патрыётаў. Гэта адна з прычын недахопаў аповесці таленавітага рускага пісьменніка Г. Бакланава «Пядзя зямлі», рамана І. Пташнікава «Чакай у далёкіх Грынях». На гэта ж указвала крытыка ў цікавых аповесцях В. Быкава «Жураўліны крык» і «Здрада».

Савецкія пісьменнікі імкнуцца ва ўсёй прыгажосці паказаць гераізм савецкіх патрыётаў, самае яркае яго выяўленне ў подзвігу (сам сэнс слова «подзвіг» мае на ўвазе захапленне, экстаз, свята духу). Подзвіг дае больш ёмістую мерку для вымярэння чалавечых здольнасцей і мажлівасцей, для вымярэння фізічных і духоўных сіл асобы. І разам з гэтым подзвігі нашых людзей адзначаны прастатой і сціпласцю, не з'яўляюцца карцінными, паказнымі. Савецкія людзі не любяць прыгожых жэстаў, гучных слоў, знешняга пафасу, таму сапраўды велічнае і гераічнае ў некаторых выпадках у мастацкіх творах уяўляецца хадульным, калі пісьменнікі ў паказе напружаных і драматычных абставін, гераізму савецкіх патрыётаў пераходзяць да напышлівай рыторыкі, ілюстрацыйнасці або апісваюць такія ўчынкі герояў, якія з'яўляюцца неверагоднымі, успрыймаюцца чытачом як дэтэктыў.

У аповесці І. Шамякіна «Пошукі сустрэчы» гераічныя ўчынкі Пятра Шапятовіча нагадваюць звычайнае прыгодніцтва, бо ў творы адсутнічае паказ праўдзівых умоў і абставін, у якіх здзяйсняліся подзвігі героя.

Для многіх баёў і партызанскіх аперацый, паказаных у «Векапомных днях» М. Лынькова, характэрна таксама прыгодніцтва, але яно цесна звязана з сапраўднымі ўмовамі партызанскай барацьбы, са своеасаблівым фальклорна-рамантычным успрыманнем пісьменнікам героікі Вялікай Айчыннай вайны. Можна гаварыць аб народна-легендарнай форме адлюстравання героікі ў рамане-эпапеі М. Лынькова. Праўда, і ў «Векапомных днях» сустракаюцца аднатыпныя, спрошчаныя апісанні ваенных баталій.

Своеасаблівае, рамантычна-мастацкае бачанне рэчаіснасці або асобных яе бакоў, рамантычнае ўспрыйманне з'яў жыцця не вызваляе пісьменніка ад асноўнага патрабавання сацыялістычнага рэалізму—сродкамі любога стылю пісаць праўду жыцця. Для многіх твораў савецкай літаратуры («Маладая гвардыя» А. Фадзеева, «Чалавек і зброя» А. Ганчара, раманы М. Стэльмаха і г. д.) характэрна рамантычная ўзнёсласць апавядання. Пісьменнікі далі хвалюючыя праўдзівыя прыклады гераізму, азарылі іх святлом рамантыкі.

Часта пад выглядам рамантычных твораў для моладзі з'яўляюцца ў друку творы, у якіх гераізм савецкіх людзей паказваецца павярхоўна-спрошчана, якія мала чым адрозніваюцца ад звычайных дэтэктываў. Нядаўна выйшла ў свет кніга «Над намі навальніцы»—першы твор Ніны Галуза, у якім аўтар імкнуўся адлюстраваць героіку моладзі ў суровыя дні Вялікай Айчыннай вайны. Ужо сам паказ ворагаў у зніжаным плане, як абмежаваных, баязлівых, небоездольных ваяк, не адпавядае гістарычнай праўдзе, прыводзіць ускосна да няправільнай ацэнкі подзвігу нашага народа ў разгроме фашысцкай Германіі. Толькі шырока паказваючы сілу ваеннай машыны германскага фашызму, выключную складанасць барацьбы супраць захопнікаў, можна раскрыць веліч нашых перамог. Подзвігі савецкай моладзі ў аповесці «Над намі навальніцы» з'яўляюцца неверагоднымі. Юныя героі-падпольшчыкі, якія нядаўна сядзелі за школьнымі партамі, амаль адкрыта, пад носам у фашыстаў праводзяць адказныя аперацыі. Па сутнасці, у аповесці Галуза паказваецца не жорсткая і крывавая вайна, а гульня ў вайну. Такое ўражанне не пакідае чытача, хоць у творы ёсць і праўдзівыя сцэны зверства фашыстаў, бо ў аповесці «Над намі навальніцы» адсутнічаюць глыбока раскрытыя гераічныя характары, якія дзейнічалі б у сапраўдных, складаных і драматычных абставінах вайны.

Падзеям вайны прысвечаны і раман А. Кулакоўскага «Сустрэчы на ростанях» (гэта другая кніга рамана «Расстаёмся ненадоўга»). Пісьменнік праўдзіва і ярка паказаў зацятую барацьбу партызанскага злучэння супраць карнікаў, цяжкія дні блакады. Але А. Кулакоўскі захапіўся прыгодніцка-рамантычным бокам сустрэч герояў на ростанях, хоць у сапраўднасці такіх сустрэч у грозныя дні вайны было мала. К. Сімана ў у сувязі з крытычнымі заўвагамі ў адносінах да кампазіцыі яго рамана «Жывыя і мёртвыя» адзначаў: «Як можна пісаць аб такой вайне, для ўласнага задавальнення і задавальнення чытачоў, наладжваючы сустрэчы, якія не маглі адбыцца, прыдумваючы спатканні, якім няма месца на вайне, або пры дапамозе аўтарскага самавольства даведваючыся аб людзях тое, чаго нельга было даведацца!»

Выратаванне парторга Мікіты Мінавіча, які трапіў у засценак гестапа, адбылося ў сувязі з выпадковай сустрэчай дакторкі Марыі Корневай са сваім родным братам, які аказаўся сярод уласаўцаў. Інтымныя адносіны Корневай і партызанскага камандзіра Андрэя Сакольнага перайначыліся таксама ў сувязі з выпадковымі сустрэчамі: Марыя ў час адпачынку ў сваякоў, якія жылі ў савецкім тыле, сустрэла жонку Андрэя, пасля чаго імкнецца задушыць свае пачуцці кахання да Андрэя і г. д. Ці не зашмат у рамане падобных выпадковасцей?!

Наогул раман «Сустрэчы на ростанях» напісаны таленавітым пісьменнікам няроўна. Тут і апісанні суровых у сваёй праўдзівасці партызанскіх баёў, і сцэны, напісаныя ў наіўна-рамантычным плане, блізкія да дэтэктыва (выратаванне Мікіты Мінавіча), і падрабязны мастацкі бытапіс (Корнева на пабыўцы).

Лепшыя творы аб вайне сілай свайго мастацкага слова, адлюстравання героікі народа заўсёды будуць служыць высокім ідэйна-выхаваўчым задачам нашага грамадства, будуць выхоўваць нашу моладзь і ўвесь народ у духу гарачай любві да сваёй радзімы, у духу пастаяннай гатоўнасці абараняць гістарычныя заваёвы савецкага народа. Ваенная тэма заўсёды будзе прыцягваць увагу нашых пісьменнікаў. Але тэма сучаснасці, тэма камуністычнага будаўніцтва ў нашай краіне стала галоўнай для сённяшняй савецкай літаратуры. «Няма больш высакароднай і пачэснай задачы, чым задача, якая стаіць перад нашым мастацтвам, — адлюстраваць гераічны подзвіг народа—будаўніка камунізма» (М. С. Хрушчоў).

СУЧАСНАЯ беларуская проза яшчэ ў вялікім даўгу перад народам. У нас мала твораў, якія ярка адлюстроўваюць нашу гераічную сучаснасць, ад пачатку да канца прасякнуты велічнымі ідэямі пабудовы камуністычнага грамадства ў нашай краіне. У творах не часта сустракаюцца героі, за якімі б хацелася ісці на працоўныя і воінскія подзвігі. Стварыць яркія вобразы нашага сучасніка, гераічныя характары — галоўная задача нашай сённяшняй літаратуры.

Павел ДЗЮБАЙЛА.

Падзеі. Факты. Навіны

Працоўныя Рэчыцкага раёна з нецярплівасцю чакаюць кожны нумар сваёй раённай газеты «Зара камуны». Асабліва любяць чытачы з густам афармленую, багата ілюстраваную «Старонку выхаднога дня», якая змяшчаецца ў газеце па нядзелях. У ёй можна знайсці нарысы і карэспандэнцыі пра лепшых людзей раёна, пра членаў брыгад камуністычай працы.

Друкуюцца вершы, байкі, фельетоны і апавяданні пачынаючых аўтараў Л. Шапурава, Л. Балачковай, А. Бякрэева, Я. Дзейкун, Р. Шамалава і інш.

У «Старонках выхаднога дня» ёсць куток для дзяцей.

П. КРУК.

□ Работнікі часопіса «Бярозка» сустрэліся з юнымі чытачамі масавай бібліятэкі № 1 Кастрычніцкага раёна сталіцы. Адказны сакратар рэдакцыі часопіса М. Гамолка расказаў аб рабоце часопіса, яго далейшых творчых планах. Школьнікі выказалі пажаданне, каб часопіс больш асвятляў жыццё школ і піянераў, часцей пісаў пра дзяцей краін народнай дэмакратыі, Афрыкі.

Перад юнымі чытачамі выступілі з чытаннем сваіх вершаў П. Рунец і Р. Барадулін.

Л. ФРЫД.

□ Будаўнікі Мінскага будаўнічага трэста № 4 сабраліся ў клубе свайго інтэрната на літаратурны вечар. Аб беларускай літаратуры, яе барацьбе за мір расказаў малады крытык Уладзімір Бойка. Свае вершы прачыталі маладыя беларускія паэты Юрась Свірка, Іван Сіпакоў, Генадзь Кляўко.

У клубе была арганізавана тэматычная выстаўка кніг беларускіх пісьменнікаў. Прысутныя пазнаёміліся з рэкамендацыйнымі спісамі літаратуры, прысвечанай барацьбе за мір.

ВЫЙШЛІ З ДРУКУ

У Дзяржаўным выдавецтве БССР выйшлі з друку і паступілі ў продаж наступныя кнігі:

Сцяпан Кухараў. Людзі крылатага ўзросту. Нарыс. Мастак І. Славянін. Тыраж 3 500 экз., стар. 44. Цана 3 кап.

Пётр Валкадаеў. Механізатар Андрэй Худзякоў. Нарыс з серыі «Нашы сучаснікі». Мастак І. Славянін. Тыраж 5 150 экз., стар. 44. Цана 3 кап.

Васіль Данілевіч. Сталявар Дзмітрый Барашкін. Нарыс з серыі «Нашы сучаснікі». Мастак М. Шырокаў. Тыраж 4 150 экз., стар. 48. Цана 3 кап.

Ілья Клаз. Машыніст Анатоль Шабуняеў. Нарыс з серыі «Нашы сучаснікі». Тыраж 5 150 экз., стар. 32. Цана 2 кап.

Пятрусь Броўка. Маладым сябрам. Вершы. Малюнкі У. Пасюкевіча. Вокладка і тытул Е. Лось. Тыраж 7 400 экз., стар. 96. Цана 8 кап.

Рыгор Няхай. Размова з восенню. Вершы. Мастак Е. Аўчыннікава. Тыраж 2 350 экз., стар. 100. Цана 15 кап.

Станіслаў Шушкевіч. Услед за марамі. Вершы. Мастак В. Харэўскі. Тыраж 1 690 экз., стар. 48. Цана 5 кап.

Аляксандр Лазнявы. Дарога ў горы. Аповесць. На рускай мове. Мастак Н. Паплаўская. Тыраж 40 тыс. экз., стар. 160. Цана 26 кап.

Уладзімір Шахавец. Месца ў жыцці. Аповесці. На рускай мове. Мастак П. Калінін. Тыраж 50 тыс. экз., стар. 254. Цана 51 кап.

Эдуард Валасевіч. З хворай галавы на здаровую. Аднаактовыя камедыі і скетчы. Мастак Г. Грамыка. Тыраж 2 550 экз., стар. 64. Цана 13 кап.

Алесь Махнач. Аднаактовыя п'есы. Мастак В. Харэўскі. Тыраж 4 100 экз., стар 60. Цана 10 кап.

Канстанцін Цітоў. Лясны маршрут. (Запіскі юнага турыста). Для сярэдняга ўзросту. На рускай мове. Мастак Е. Кулік. Тыраж 40 тыс. экз., стар. 88. Цана 12 кап.

Для школьнай эстрады. Склаў Георгій Шыловіч. Афармленне Ул. Жыжэнкі. Зборнік для сярэдняга ўзросту. Тыраж 6 350 экз., стар. 148. Цана 22 кап.

Алесь Пальчэўскі. Аля і Галя. Апавяданні. Для малодшага ўзросту. Мастак Ул. Лось. Тыраж 7 600 экз., стар 88. Цана 13 кап.

Тарэнь Масэнка. Вішнёвыя зоры Украіны. Вершы. Аўтарызаваны пераклад з украінскай мовы беларускіх паэтаў. Прадмова Рыгора Няхая. Мастак М. Шырокаў. Тыраж 1 200 экз., стар. 172. Цана 33 кап.

Вілем Грос. Распасцёршы крылы. Аповесць. Пераклад з эстонскай мовы Усевалада Краўчанкі. Мастак А. Кашкурэвіч. Тыраж 2 700 экз., стар. 232. Цана 53 кап.

С. Улуг-Зода. Раніца нашага жыцця. Аповесць. Для сярэдняга ўзросту. Пераклад І. Сакалоўскага і Ул. Жыжэнкі. Малюнкі П. Кірпічова. Тыраж 3 550 экз., стар 324. Цана 65 кап.

РАБОТЫ КІТАЙСКІХ ФОТАМАЙСТРОЎ

Як мы паведамлялі ўжо, у Мінску знаходзіцца выстаўка мастацкай фатаграфіі майстроў Кітайскай Народнай Рэспублікі.

Публікуем тры работы з гэтай выстаўкі.



Суян Цюань. «Партрэт дзяўчыны»

Сунь Чжун-цзінь. «Вясна».

Сунь І-фу. «Пакарыцелі пяску».

ЖЫВЫ ГЕЙНЭ

Як вартавы ў часы вайны за
волю,
Я з ворагамі біўся трыццаць
год.
Знаў—бацькаўшчыны не
пабачу болей,
Ні славы не знайду,
ні ўзнагарод...

Так, не дзеля славы і не дзеля ўзнагарод біўся з ворагамі сваёй айчыны Гейнэ, знішчаў іх напавал «расплаўленым металам» сваіх гнеўных вершаў, сваіх «забойчых, едкіх эпіграм». Слава прыйшла сама—сусветная слава і вышэйшая з усіх узнагарод—любоў і ўдзячная памяць народа.

Мільёны чытачоў ва ўсім свеце назаўсёды ўзяла ў палон і цудоўная гейнаўская лірыка і пякучая сіла яго палітычнай паэзіі. І нашы дні з новай сілай сцвярджаюць сапраўдную веліч і мастацкую сілу твораў гэтага волата нямецкай літаратуры. Гейнэ змагаецца і сёння. Яго з поўнай падставай можна назваць паэтам сучаснасці. Вершы, якія былі напісаны больш ста год назад і сваёй бязлітаснай і дасціпнай сатырай былі накіраваны супраць феадалаў, царкоўнікаў, баязлівых бюргераў-буржуа, безгаловай прускай ваеншчыны, надзіва сугучны падзеям у сучаснай Заходняй Германіі. Яны не ў брыво, а ў вока б'юць праціўнікаў адзінства Германіі, праціўнікаў яе патварэння ў дэмакратычную і міралюбівую краіну. Здаецца, менавіта Адэнаўэру і яго партыі «хрысціянскіх дэмакратаў» могуць быць адрасаваны поўныя нянавісці і пагарды словы, што былі сказаны Гейнэ аб нямецкіх клерыкалах:

Асліная дурасць, сабачая злосць
Захлёбваліся ад шалу.
На жаль, і цяпер яшчэ многа
ёсць
Прыхільнікаў цемрашалу.

Паэт нібыта толькі пабываў у ФРГ і піша пра тых, хто зараз задае там тон, аб тых, чыімі клапатлівымі апекунамі з'яўляюцца правіцелі бонскай Германіі і іх закаінскія гаспадары — пра недабітых гітлераўскіх генералаў, фашыстаў і рэваншыстаў:

У гэтым нудным, замшэлым
гняздзе
Нішто мяне не трымала.
Гуляючы, бачыў я прускіх ваяк,
Яны змяніліся мала.
Такі ж, як і быў, дубовы народ,
Заядлыя службісты;
Сякуць нагамі паветра і брук,
Задраўшы нос ганарысты.

Які ні возьмеш з палітычных вершаў Гейнэ — яны нібыта аб сённяшнім дні, радкі іх выкрываюць і клічуць на барацьбу, змагаюцца і перамагаюць. «Наш новы спеў, наш лепшы спеў», да якога заклікаў Гейнэ, шырока і свабодна гучыць у першай у гісторыі Германіі дзяржаве нямецкіх рабочых і сялян — Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы, гучыць у Савецкім Саюзе і ва ўсіх краінах лагера сацыялізма. Ён не змаўкае ў сэрцах усіх прагрэсіўных людзей свету. Цяжка хворы, прыкаваны ў апошнія гады свайго жыцця да «матрацнай магілы», Гейнэ пісаў:

Свабодны пост! Усё слабее цела...
Змяніць байца!—такі даю наказ.
Але не здамся—зброя ж
уцалела,
Хоць сэрца б'ецца ўжо апошні
раз.

Магутная зброя паэта — яго вершы — уцалела і сёння выкарыстоўваецца. Таму зразумелая вялікая цікавасць да творчай спадчыны Генрыха Гейнэ з боку усіх народаў свету. Творы вялікага нямецкага паэта перакладзены на многія мовы. Гучаць яны і па-беларуску. Вершы Г. Гейнэ ў гэтым артыкуле цытуюцца з «Выбраных твораў» Генрыха Гейнэ, перакладзеных на беларускую мову.

Здарылася так, што ў час выхаду ў свет—у 1959 г.—гэтай добрай і патрэбнай кнігі перакладаў, аб ёй гаварылі мала. А шкада. І сам факт выдання на беларускай мове лепшых твораў выдатнага паэта, класіка сусветнай літаратуры, і мастацкая якасць перакладаў заслугоўваюць вялікай і грунтоўнай размовы.

У зборнік увайшлі вершы Гейнэ амаль з усіх асноўных цыклаў паэта: тут і лепшыя творы «Кнігі песень», і найбольш выдатныя яго палітычныя вершы розных год, і вяршыня творчасці Гейнэ—паэма «Германія». Заслугай перакладчыкаў, бясспрэчна, з'яўляецца тое, што яны спынілі сваю ўвагу на гэтых найбольш значных і важных у паэзіі Гейнэ творах. Не абмінулі перакладчыкі «Грэнадзёраў» і «Нявольніцкі карабель», такія шэдэўры, як «Ткачы» і «Аслы-выбаршчыкі» і інш. Шкада толькі, што вершы «Міхель пасля сакавіка», «Палітычнаму паэту» і некаторыя іншыя, таксама вельмі важныя для вызначэння стылю і характару сатыры Гейнэ і яго пазіцыі ў пытаннях узаемаадносін мастака і грамадства, не трапілі ў зборнік.

Не ўсе пераклады паўнацэнныя па сваіх мастацкіх якасцях. І здарылася гэта ў пэўнай ступені таму, што ў кожнага з перакладчыкаў—іх шасцёра — М. Багдановіч, А. Зарыцкі, Я. Семяжон, Ю. Гаўрук, А. Вяржбоўскі, І. Сіманоўскі, —свой творчы падыход да перакладчыцкага майстэрства, сваё ўменне «ўжыцца» ў паэзію Гейнэ.

Выявілася і яшчэ недастатковая практыка перакладаў паэзіі Гейнэ. На рускую мову, напрыклад, Гейнэ перакладаюць больш стагоддзя і ў ліку перакладчыкаў яго паэзіі такія паэты, як М. Лермантаў, М. Міхайлаў, Ф. Цютчаў, П. Вейнберг, А. Блок, В. Брусаў і многія іншыя.

Пераклад шасці вершаў Гейнэ належыць выдатнаму беларускаму паэту Максіму Багдановічу. За выключэннем верша «Генрых», усе яны—вершы лірычных цыклаў. І Багдановіч перадае іх з уласцівай яму пяшчотнасцю, мяккім лірызмам, перадае сакавітай, выразнай мовай. Дарэчы, пераклады Багдановіча — гэта яркае сведчанне невычэрпных магчымасцей беларускай мовы ў перадачы лепшых твораў сусветнай паэзіі. Пераклад М. Багдановічам гейнаўскага «Ein Fichtenbaum steht einsam...» можна смела паставіць побач з лермантаўскім перакладам гэтага верша: «На севере диком стоит одиноко...»

У паўночным краю на кургане
Сасна адзінока стаіць;
Акутаўшысь лёдам і снегам,
Як белай адзежынай, спіць.
І бачыць у сне яна пальму,
Што ў дальняй паўдзённай
зямле
Самотна стаіць і нудзьгуе
На спаленай сонцам скале.

Удалыя, сапраўды мастацкія, творчыя пераклады на радзе вершаў прадэманстравалі і астатнія перакладчыкі твораў Гейнэ. На наш погляд, А. Вяржбоўскаму найбольш удаўся пераклад верша «Enfant perdu», урыўкі з якога прыведзены ў пачатку артыкула, А. Зарыцкаму — «Грэнадзёры», Ю. Гаўруку — «Ткачы» і вершы лірычных цыклаў. Я. Семяжону і І. Сіманоўскаму, якім належыць пераважная большасць перакладаў, таксама ў большасці выпадкаў спадарожнічала творчая ўдача.

Нельга прайсці і міма тых прыкрых недахопаў, якія псуюць агульнае добрае ўражанне ад перакладаў. Станоўча ацэньваючы ў цэлым пераклад Ю. Гаўруком паэмы «Германія» — у перакладзе захаваны і высокі пафас, і гнеўная іронія, і страснасць арыгіналу—нельга не адзначыць, што перакладчык не заўсёды рупліва працаваў над вершам. Тым больш прыкра, што гэта адчуваецца часта ў найбольш моцных і выразных месцах лепшага гейнаўскага твора. У арыгінале:

Ich kenne die Weise, ich kenne
den Text,
Ich kenn' auch die Herren
Verfasser;
Ich weiß, sie tranken heimlich
Wein
Und predigten öffentlich
Wasser.

Рускі пераклад «Германіі» В. Левіка трапна і з дакладнасцю перадае падтэкст гэтых пякучых радкоў:

Я знаю мелодию, знаю слова
Я авторов знаю отлично;
Они тайком тянули вино,
Проповедуя воду публично!

У Ю. Гаўрука:

І словы і музыку ведаю я,
І аўтараў знаю цынічных;
Употай віно п'юць, а кваляць
ваду
Ў сваіх прамовах публічных.

Розніца відавочная. Пераклад б'е «ў лоб», а таму не перадае ў поўнай меры тонкай і таму яшчэ больш гнеўнай і трапнай іроніі Гейнэ.

Недакладнасці і скажэнні ў перадачы аўтарскай думкі сустракаюцца і ў некаторых іншых перакладах. Так, у вершы «Аслы-выбаршчыкі» (пераклад І. Сіманоўскага) сцвярджаецца: «Іх камітэт складаўся з адных старааслоў, з пагардай адносіліся яны да ўсіх без трохкаляровай какарды». Аб якой «трохкаляровай какардзе» ідзе размова? Сярод рэвалюцыянераў таго часу папулярны быў і трохкаляровы сіне-белачырвоны сцяг французскай рэвалюцыі. У арыгінале ж і ў выдатным рускім перакладзе Ю. Тынянава зусім зразумела гаворыцца, што «стараслы», гэта значыць здраднікі нямецкай рэвалюцыі 1848 года, «носили кокарды на голове чёрно-красного, с золотом, цвета» — колеру манархічнай Германіі.

Але ўсё гэта, паўтараем, толькі ў нейкай меры псуе агульнае добрае ўражанне ад перакладаў. І той жа Ю. Гаўрук у лепшых радках свайго перакладу «Германіі» дакладна і ярка перадае моц і выразнасць гейнэўскага тэксту:

Сядзі ў сваёй яме і не вылазь!
Твая гаспадарка — Кіфгайзер.
Калі цвяроза на рэчы глядзець,
На ліха нам здаўся кайзер!

Магутная зброя вялікага сына Германіі Генрыха Гейнэ — яго паэзія — жывая і гучыць на ўсю сваю моц на беларускай мове.

Б. ФІРШТЭЙН.

ВЕЧАРЭЕ

Фотаэцюд П. ЧАЙКОЎСКАГА.

З 7 па 14 кастрычніка ў мінскім магазіне «Кнігі краін народнай дэмакратыі» праходзіць Тыдзень кніг ГДР. У сувязі з гэтай падзеяй друкуем падборку матэрыялаў.

НЯМЕЦКАЯ ЛІТАРАТУРА НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Першыя пераклады нямецкай паэзіі ў беларускім друку з'явіліся яшчэ да рэвалюцыі.

У 1909 годзе М. Багдановіч пераклаў на беларускую мову вершы Генрыха Гейнэ «У паўночным краю на кургане сасна адзінока стаіць...», «Азра», «Дзяцюк шчыра любіць дзяўчыну...», «Калі любоў ізмучыць...», «Калі маеш шмат чаго...» і «Генрых». У 1910 годзе ён жа пераклаў верш Ф. Шылера «Хочаш сябе ты пазнаць».

Але толькі пасля Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі беларускі друк пачаў шырока знаёміць нашага чытача з нямецкай літаратурай. У 1928 годзе беларускі паэт Юрка Гаўрук пераклаў некалькі вершаў Ф. Шылера і Г. Гейнэ.

Творы Г. Гейнэ друкаваліся на беларускай мове ў часопісах «Маладняк» (1928, 1932 гг.), «Аршанскі маладняк» (1928 г.) і «Полымя рэвалюцыі» (1932—1933 гг.), газетах «Літаратура і мастацтва» (1934—1935, 1937 гг.), «Савецкая Беларусь» (1925 г.), «Чырвоная змена» (1936 г.).

Вершы Ф. Шылера друкаваліся ў часопісе «Маладняк» у 1926 годзе. У 1934 годзе ў перакладзе А. Дудара была выдадзена яго п'еса «Вільгельм Тэль».

Літаратуразнаўца А. Баршчэўскі выбраў і пераклаў афарызмы В. Гётэ. Яны былі апублікаваны ў 1932 годзе ў часопісе «Полымя» (№ 1). У гэтым жа нумары часопіса быў змешчан верш В. Гётэ «Праметэй» у перакладзе Ю. Таўбіна. У 1935 годзе часопіс публікуе ўрыўкі з «Фауста» ў перакладзе А. Дудара.

Вершы Э. Вайнерта друкаваліся ў 1932—37 гадах у газеце «Літаратура і мастацтва» і ў 1953 годзе ў часопісе «Маладосць». У 1953—54 гадах друкаваліся вершы нямецкага паэта Кубы ў перакладах Р. Няхая і С. Дзяргая.

Вялікае месца на старонках беларускага друку займаюць творы І. Бехера. Многа яго вершаў змяшчалася ў перыядычных выданнях у 1927—1936 гадах, а таксама ў 1954 годзе. У 1931 годзе ў «Полымі» (№ 10) была апублікавана паэма І. Бехера «Я васпяваю пяцігадовы план». Друкавалася на беларускай мове і проза І. Бехера. У 1931 годзе выйшаў яго раман «Люізіт». У «Полымі» (нумар 3) за 1927 год быў змешчан яго партрэт з надпісам: «Іаганэс Бехер, нямецкі пралетарскі пісьменнік, які выказаў жаданне быць пастаянным супрацоўнікам часопіса «Полымя».

У 20—30 гады ў беларускіх часопісах друкаваліся таксама празаічныя творы Г. Поля, Э. Глезера, К. Клебера, Г. Мархвіцы і інш.

У 1953—60 гадах на беларускую мову перакладзены навелы, апавяданні і ўрыўкі з раманаў А. Зегерс, П. Кёзнер-Шрэдэр, Г. Кубшы, А. Лангера, Г. Ледзіга, Э. Лёста, Х. М. Раўхеруса, Ш. Фіндлінга, Б. Фрэя, К. Цэйслера і інш.

Дзяржаўнае выдавецтва БССР выдала таксама многа кніг нямецкіх аўтараў.

Н. САЎЧАНКА.

Дзітман Ганс АНГЛЕР

ЭКЗАМЕН

АПАВЯДАННЕ

Ледзь глянуўшы на мяне, мужчына ў кіцелі кінуў мне прамаслены камбінезон, пару пальчатак, гумавыя боты. Праз некаторы час я ўжо стаяў перад доўгім белым цэхам рыбакамбіната.

Нязвыклае адзенне скоўвала рухі, пакутліва ныла правая нага, сціснутая цесным ботам. Я нерашуча агледзеўся. Ля прычала грукаў маторам падрыхтаваны да рэйса катэр, з прарэзлівымі гудкамі насіліся нагружаныя ільдом электракары. Усюды мітусня, гоман, паспешлівасць.

Куды дзелася мая бестурботная самаўпэўненасць? Усё тут было чужым — завод, боты, людзі. Ніхто не звяртаў на мяне ўвагі, ніхто не падышоў да мяне з працягнутай рукой, каб сказаць: «Калі ласка! Мы ганарымся тым, што вы не адмовіліся працаваць з намі — простымі рабочымі! Вы так патрэбны нам!»

«Гэй, ты! Сцеражыся!» Спалохаўшыся, я адскочыў у бок. Успатнелы рабочы, што перакочваў бочку з селядцамі, пахмура паглядзеў на мяне. Мне стала прыкра — няма чаго казаць, добры пачатак!

«Але я яшчэ пакажу ім сябе! — з абурэннем думаў я. — Як абяцаў на сходзе групы, так і зраблю. Папрацую тут усе 14 дзён і ні гадзіны менш!» Рашучым крокам я накіраваўся ў цэх.

Тут быў прыемны халадок. Ля пад'ёмніка ішла разгрузка. Умацаваныя на тоўстых канатах крукі падхоплівалі скрынкі з рыбаю і падымалі іх наверх. Хутка і рытмічна слізгалі па скрыпучых блоках канаты. Рабочы з лапатаю спрытна пасыпаў свежыя селядцы буйнамолатай соллю.

Трэба было адшукаць начальніка цэха. На перавернутай бочцы сядзела маладзенькая дзяўчына і папраўляла хустку. На маё пытанне, дзе начальнік, яна кіўнула на маленькія вузкія дзверы ў канцы цэха: «Ідзі прама. Магчыма, табе пашанцуе. Часцей за ўсё ён бывае там, дзе яго не знойдзеш». І ўжо з цікаўнасцю: «Будзеш працаваць у нас?»

— Так. Два тыдні.

— Ах, ты студэнт? Ну табе хопіць...

Я так і не зразумеў, што было ў гэтых словах — злараднасць ці спачуванне?.

Мне пашанцавала. Начальнік цэха сядзеў за сталом і размаўляў з мужчынам сярэдніх год, у сінім заплямленым кіцелі. Пажылая жанчына з сівымі валасамі штосьці адстуквала на машынцы. Я працягнуў ёй накіраванне.

— На разгрузку? — яна запытальна зірнула на начальніка.

— Што там? Допуск?

— Так. Студэнт. Павінен адпрацаваць два тыдні на рыбакамбінаце.

— Ганс! Табе патрэбны людзі? Забірай яго сабе. Ён хлопец дужы!

Той, каго звалі Гансам (пазней я даведаўся, што ён быў майстрам па засолцы), паглядзеў на мяне.

— Калі ты думаеш прыступіць да працы, паніч?

— Неадкладна! —адказаў я.

— Цудоўна!

Ён устаў і кіўком загадаў мне ісці за ім. Мы зноў прайшлі праз доўгі сыраваты цэх і па вузкай драўлянай лесвіцы, што блішчэла ад тлушчу, спусціліся ў пограб. Тут была засолачная.

За шырокімі, заваленымі рыбай сталамі, стаялі жанчыны. Яны сартавалі селядцы і складалі іх у бочкі, што стаялі побач. Пласт селядцоў засыпаўся пластам грубапамолатай солі. Абцягнутыя гумавымі пальчаткамі рукі работніц мільгалі над грудамі серабрыстай рыбы. Я ўбачыў двух маладых, у адных толькі майках рабочых, якія адкрывалі скрынкі з рыбай і адсоўвалі поўныя бочкі. Іх твары былі чырвоныя ад напружання, на ілбах блішчэлі кроплі поту. Я падмяніў аднаго з іх.

Маім напарнікам аказаўся ўвішны хлопец з Саксоніі. Праз колькі хвілін ён ужо расказаў мне, што ўцёк з завода, дзе працаваў, бо тут, на камбінаце, можна больш зарабіць.

— Гэта ж ясна,—гаварыў ён,— жанчыны выконваюць за змену 180—200 працэнтаў нормы. Нам залічваецца такі ж працэнт выканання. Гэта выходзіць па тры з палавінаю—чатыры маркі за гадзіну — пэўных васемсот марак за месяц. Ну, а скончыцца сезон — я таксама сумаваць не буду! Галоўнае — не гублянца! Як ты лічыш? — спытаў ён мяне, хітра ўсміхаючыся.

Мой ківок быў вельмі стрыманы. Такія паводзіны здаваліся мне вельмі лёгкадумнымі. Але выказаць свае думкі ўголас я не адважыўся. Не задзіраецца! У душы я праклінаў сваё вельмі гучнае абавязацельства. Мае рукі ўжо ныілі. Ох, гэтая праклятая фізічная праца. Расол, які пырскаў са скрынь, ручайкамі сцякаў па майму камбінезону, смурод быў нязносны, падлога мокрая і слізкая. Усюды валялася скінутая са сталоў і растаптаная рыба, павялічваючы небяспеку, што ты пакаўзнешся. І да ўсяго гэтага — пастаянныя крыкі жанчын: «Давай ры-ы-бу!.. Адсоўвай бочк-і-і!.. Ры-ы-бу!»

«Знарок пацяшаюцца, ганяючы мяне, як сабаку!» — з сумам думаў я, у той час, як усё маё цела аблівалася потам. Мой напарнік, здавалася, працаваў жартуючы. Ён лаяўся, кпіў з жанчын, курыў і нястомна падсоўваў мне ўсё новыя і новыя скрынкі. Спаражніць скрынку, адсунуць яе ўбок... Адкрыць бочку, спаражніць яе, адкаціць убок... Прыняць скрынку, спаражніць яе... і так зноў і зноў. Я адчуваў, што ўжо выдыхаюся, малаток дрыжыць у мяне ў руках. У гэты час саксонец нечакана сказаў мне: «Пастой, адпачні крыху. Спачатку ў мяне таксама атрымлівалася паршыва. Потым ты прывыкнеш...»

Я з удзячнасцю паглядзеў на яго. Аказваецца, хлопец быў не такі ўжо дрэнны. Хоць працаваць са мною яму было цяжэй, чым з ранейшым напарнікам, саксонец не бурчаў. Міма нас часта праходзіў майстар, але ён зусім не звяртаў на мяне ўвагі. «Для яго гэта справа звыклая, — злосна думаў я. — Вось ён і прымушае мяне працаваць, як каня, і нават не пацікавіцца, як я магу ўсё гэта вытрываць!»

Паспрабаваўшы ўзяць сябе ў рукі, я стараўся больш эканомна і дакладна рабіць рухі, хутчэй падаваць скрынкі, каб мець магчымасць перадыхнуць. Спачатку гэта ўдавалася, але хутка зноў наступіў крызіс. Я ўжо не працаваў, а толькі механічна рухаў знясіленымі рукамі. Роспач і абыякавасць авалодалі мною.

Ці можна было думаць, што праца з самога пачатку акажацца такою цяжкой, што мне так цяжка будзе выканаць сваё абавязацельства? Не, я кіну! Хто можа ўтрымаць мяне? Гэта ж так проста — я падыду да майстра і скажу: «Прабачце, але я думаў, што ўсё гэта куды лягчэй. Я пакідаю!». Пасля гэтага скласці чамадан і праз гадзіну ўсе гэтыя бочкі з рыбаю, і камбінат, і ўвесь горад застануцца далёка ззаду. Гэтыя думкі прыносілі мне тайную радасць, нават скрынкі нібы сталі лягчэйшымі! Але што скажа наша група? Гэтая думка абпаліла мяне. Я адчуў бяссільную злосць — так, папаўся! Вядома, усе студэнты будуць рагатаць — бо я абавязаўся адпрацаваць тут два тыдні, а ўцяку ў першы ж дзень! Ці зразумеюць мяне, калі я буду расказваць пра гэта? Павінны зразумець! А калі не зразумеюць? Ты ўцёк! Ну, добра, я ўцёк! Але ж я не магу больш!.. Я павінен? Мне гэта зусім непатрэбна, калі я не жадаю! Хто можа асудзіць мяне? Я сам? Вось у гэтым і справа! Якое нікчэмнае паражэнне! Але ж я не магу больш! Не магу!..

— Ну, паніч? — я нават не заўважыў, як да мяне падышоў майстар. — Гэта, мабыць, не тое, што сядзець цэлы дзень, сагнуўшыся, над кнігамі?

Я павярнуў да яго ўспатнелы твар. Вось зручны выпадак пакласці канец гэтай катарзе!

— Так, гэта зусім іншае. Цяжкая гэта фізічная праца!

Майстар кіўнуў.

— Нямногія з тых, хто прыходзіць з універсітэта, вытрымліваюць тут. Зарабіць грошай? Так, калі ласка! Але працаваць — не, прабачце!.. Хто вытрымаў тут, той можа сказаць, што ён папрацаваў... Ты таксама можаш сказаць гэта, паніч, нават калі спачатку табе і тугавата будзе!

І майстар з усмешкаю паглядзеў на мяне. Я стомлена кіўнуў галавою. Яго пахвала збянтэжыла мяне... Праклянце! Я ж таксама хачу ўцячы! Што ён падумае цяпер пра мяне?

— Герберт! — звярнуўся майстар да саксонца, які дыміў адсырэлай цыгарэтай. — Мы ўжо апрацавалі дзвесце цэнтнераў звыш нормы. Можна было б дагнаць выпрацоўку да 275 працэнтаў... Але калі вы стаміліся, на гэтым можна кончыць.

— Добра, мы яшчэ папрацуем. — Герберт падбадзёрваюча кіўнуў мне. — Рыбу ж трэба адправіць!

— Парадак, юнак! Але спачатку давайце паабедаем!

Жанчыны знялі гумавыя фартухі і, размаўляючы, падымаліся наверх. Мы павольна паследавалі за імі. У нізкім падвальным памяшканні адзінока стаялі сталы з кучамі рыбы. Наверсе ззяла сонца.

Як толькі мы зайшлі ў сталовую камбіната, нас ахінуў шум галасоў, стук нажоў і відэльцаў. Атрымаўшы свае порцыі, мы селі за незаняты столік. Пасля цяжкай працы мы добра выгаладаліся.

Першым адсунуў сваю талерку Ганс.

— Вып'еце са мною?—звярнуўся ён да мяне і Герберта.

Ён узяў тры бутэлькі піва і прапанаваў нам цыгарэты. Як прыемна было сядзець тут і сачыць за блакітным дымам цыгарэты!

— Як цябе завуць? — раптам спытаў мяне майстар.

— Мяне? Петэр Крэльм.

— Значыць—Петэр. Мяне завуць Ганс. Герберта ты ўжо ведаеш. Я хацеў табе гэта яшчэ раней сказаць, Петэр. Мы вельмі недаверлівыя, калі да нас прыходзяць студэнты. Яны думаюць пра сябе, што яны нямаведама які цуд! Калі ім даручыць працу, дык яны выконваюць яе дрэнна, або зусім нічога не робяць! А гэта раздражняе нашых таварышаў. Многія з абурэннем гавораць: «Няўжо гэта наша маладая інтэлігенцыя? Гэтыя надзьмутыя індыкі? Браць грошы—давайце, а ў астатнім — захоўвайце, калі ласка, дыстанцыю!» Мы ведаем, што такія не ўсе, але ёсць і падобныя тыпы. Яны выклікаюць абурэнне, асабліва ў старых рабочых, якія не шкадавалі сіл, каб вам жылося лепш. Ты не крыўдуеш?

Я праглынуў сліну.

— Вядома, не, Ганс!

Яго словы білі балюча. Павінен і я быць такім? І я таксама, як і тыя, на ўсё забыўся? Я—сын рабочага!

Я гарэў ад сораму...

— Ну, Петэр!—майстар кіўнуў мне.—Будзем працаваць.

— Так, Ганс,—адказаў я,—будзем працаваць.

Пераклад з нямецкай мовы

С. КУВАЕВА.

Галоўны рэдактар Нічыпар ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Аляксандр БУТАКОЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Васіль ІВАШЫН, Аркадзь МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), Пятро ПРЫХОДЗЬКА, Раман САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), Мікола ТКАЧОЎ, Янка ШАРАХОЎСКІ, Іван ШАЦІЛА, Рыгор ШЫРМА.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР, Минск.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі—3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара—3-25-25, аддзела літаратуры—3-22-04, аддзела мастацтва—3-24- 62, аддзела культуры—3-20-54, выдавецтва—3-19-52, бухгалтэрыі—3-11-03.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць два разы на тыдзень: у аўторак і пятніцу.

АТ 00401

Друкарня імя Сталіна